ЧАМУ БІЗНЕС НЕ ПРЫМАЕ ГІМНАСТЫКУ? **4**

ГЭТЫ НЕБЯСПЕЧНЫ ХАЛЕСТЭРЫН **6**

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

11 ЛІПЕНЯ 2018 г. СЕРАДА № 130 (28746)

РАЗЛІК НА САМІХ СЯБЕ

Фота БелТА.

Прэзідэнт запатрабаваў неадкладна заняцца развіццём Бялыніцкага раёна

Аб гэтым учора казаў беларускі лідар пры наведванні сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Калгас «Радзіма».

«Па Бялыніцкім раёне мы дамовіліся: да канца 2020 года ўсё павінна быць зроблена. Ніякай шалёнай дапамогі не будзе», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён жорстка раскрытыкаваў работу раённай і абласной улады, а таксама членаў урада, адказных за вобласць, паколькі сацыяльна-эканамічныя паказчыкі ў раёне ўпалі.

Для паспяховай работы раёну варта выбраць за арыенцір СВК «Калгас «Радзіма», упэўнены Прэзідэнт, паколькі там дзякуючы інавацыйнаму падыходу да працы і гаспадарчым адносінам да справы ўдалося стварыць паспяховую вытворчасць. Беларускі лідар папрасіў старшыню СВК Аляксандра Лапацентава дапамагчы старшыні райвыканкама ў развіцці не толькі вытворчасцяў, але і раёна ў цэлым.

СТАР. 2

ЛІЧБА ДНЯ

$346,8 млн

ужо інвеставана ў праект па стварэнні Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Гаворка ідзе пра ўсе ўкладанні. Гэта ўкладанні і нашай краіны, таму што Беларусь бюджэтам удзельнічае ў будаўніцтве інфраструктурных элементаў, уладкаванні тэрыторыі; гэта ўкладанні кіруючай кампаніі, дзе пераважна выкарыстоўваецца акцыянерны капітал нашых кітайскіх партнёраў; гэта грошы тэхніка-эканамічнай дапамогі, сродкі нашых інвестараў-рэзідэнтаў. Мяркуецца, што ў 2018 годзе аб'ём інвестыцый у парк перавысіць $180 млн. Парк пачынае цалкам функцыянаваць.

КАРАТКА

• Першы этап павышэння заработнай платы медыкам плануецца ў другім паўгоддзі 2018 года.

• Падчас заключнай фазы эвакуацыі з пячоры Кхаа Луанг у Тайландзе ўчора былі выратаваны апошнія чацвёра дзяцей і іх трэнер. Раней вадалазам удалося вывесці з пячоры восем хлопчыкаў, дзеці былі дастаўлены ў бальніцу.

• У г. п. Камарын Брагінскага раёна супрацоўнік АСВОДа выратаваў 4-гадовае дзіця, якое танула ў Дняпры. Яго маці ў гэты час размаўляла па тэлефоне. Медыцынская дапамога не спатрэбілася.

• Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў чэрвені 2018 года ў параўнанні з маем склаў 100,4 %, са снежнем 2017 года — 102,9 %.

• Паводле звестак Белстата, сярод прадуктаў харчавання ў чэрвені больш за ўсё патаннелі агуркі (на 50,68 %) і памідоры (на 24,56 %), а падаражэлі морква (на 65,34 %) і буракі (на 43,86 %).

ISSN 1990 - 763X

НА ЎСЕ РУКІ МАЙСТРЫ



У Рэспубліканскім ландшафтным заказніку «Асвейскі» Верхнядзвінскага раёна ствараецца візіт-цэнтр заказніка. На гэтым фота — дырэктар установы Ігар РАМАНЮК і вядучы спецыяліст Дзяніс РЭВІДОВІЧ. Былы будынак сельсавета стаяў без гаспадароў. Было прынята рашэнне аддаць яго прыродаахоўнай установе.

На пытанне, чаму не запрашаюць падрадныя будаўнічыя арганізацыі, Ігар Рыгоравіч адказвае: «Па-першае, бюджэт на гэты рамонт недастатковы, а па-другое, мы самі, сваімі рукамі хочам зрабіць надзейна, прыгожа — вядома, для сябе!»

— На семдзесят пяць працэнтаў рамонт мы выканалі сваімі сіламі, — кажа кіраўнік «Асвейскага». — У гэтым будынку будзе размяшчацца асноўная інфармацыя пра заказнік, турыстычны маркетынг. Тут з'явяцца зона адпачынку, прытулак для рыбакоў, прычал, экалагічная сцежка.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Верхнядзвінскі раён.

ЧАТЫРЫ ЛАПЫ, МОКРЫ НОС І СТРЭСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ

Як працуюць ратавальнікі-кінолагі?

З начальнікам кіналагічнай службы Цэнтра пошукава-выратавальных работ і пажаратушэння Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Ігарам АПАНОВІЧАМ мы гутарым каля вальераў, дзе жывуць сабакі, якія дапамагаюць ратавальнікам падчас надзвычайных сітуацый. Побач стаіць невялічкі помнік чатырохногаму памочніку. Самі ж пастаяльцы вальераў непакояцца, убачыўшы незнаёмага чалавека. Але тут жа пачынаюць дружалюбна віляць хвастом. Усяго тут знаходзяцца шэсць сабак. Усе яны адной і той жа пароды — лабрадор-рэтрывер. І ўсе яны ўжо ўдзельнічалі ў ратаванні людзей.

— Раней мы арыентавалі нашых сабак на пошук пацярпелых пад заваламі будынкаў. Але з гэтага года мы будзем займацца і пошукам зніклых людзей у лясах. Дзеля гэтага да нас далучыліся тры дадатковыя кіналагічныя разлікі. Справа ў тым, што ўніверсальнага сабакі не бывае. Яго можна навучыць працаваць або на завалах, або ў лесе, — расказвае Ігар Апановіч.

Усе нашы кінолагі атэставаны па стандартах МНС Расіі. Яны прайшлі сертыфікацыйныя выпрабаванні. Зусім нядаўна два кіналагічныя разлікі вярнуліся з горада Выцегра Валагодскай вобласці. Яны атэставаліся па першасным класе «А»: здольнасць працаваць на завалах дамоў.

СТАР. 4

РАЗЛІК НА САМІХ СЯБЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: у нечым дапамога будзе, але «не разлічвайце, што сюды хто-небудзь што-небудзь будзе ўвальваць: у нас дастаткова напрамкаў, дзе мы ўвальваць павінны і бачыць будучыню, перспектывы».

Дарэчы, СВК «Калгас «Радзіма» — гэта па-сапраўднаму моцная гаспадарка. Узровень жыцця вяскоўцаў тут зраўняўся з гарадскім, а зарплаты — адны з самых высокіх у галіне. Сярэдні заробак у калгасе ў 2017 годзе склаў 927 рублёў, сёлета ён павысіўся да 973 і працягвае расці.

У гаспадарцы больш за 60 % усіх занятых работнікаў — маладыя спецыялісты, падрыхтоўку якіх вядуць яшчэ са школы, а выдатнікаў вучобы заахвочваюць прэміямі. Больш за тое, самыя лепшыя атрымліваюць мэтавыя накіраванні ў сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы. Цікава, што маладыя спецыялісты атрымліваюць ад СВК жыллё, а таксама грашовую падтрымку на ўладкаванне. Найлепшых работнікаў адпраўляюць у элітныя санаторыі — як у Беларусі, так і ў Турцыі, Егіпце, Расіі.

Аляксандр Лукашэнка наведаў ферму па вырошчванні маладняку буйной рагатай жывёлы, а таксама музей сельгаспрадпрыемства, урачыстае адкрыццё якога адбылося 12 ліпеня 2014 года. У ім налічваецца каля тысячы экспанатаў, якія адлюстроўваюць гісторыю стварэння, станаўлення і развіцця калгаса. Тут таксама сабраны звесткі аб канкрэтных людзях — працаўніках роднай зямлі, якія гэтую гісторыю стваралі.

МОЛАДЗЬ — ПАКАЗЧЫК ДАБРАБЫТУ

Пасля гэтага кіраўнік дзяржавы накіраваўся ў летні амфітэатр, дзе звярнуўся да людзей.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў свеце няма працы больш самаадданай, чым праца аграрыяў. На яго думку, яна заўсёды была пад сілу толькі самым моцным людзям, якія шчыра любяць зямлю, вобразна кажучы — якія адчуваюць біццё яе сэрца, — і менавіта такія спецыялісты працуюць сёння ў адным з найлепшых прадпрыемстваў нашай краіны — Бялыніцкім СВК «Калгас «Радзіма».

«Яго гісторыя даўно стала паказальнай для ўсяго аграпрамысловага комплексу. Калі бачыш вашы дасягненні, не верыцца, што калісьці гаспадарка была стратная, — сказаў Прэзідэнт. — Але, пераадолеўшы нялёгкія часы, вы ператварылі яе ў высокаразвітую вытворчасць, сучасную і паспяховую. Я вам за гэта шчыра дзякую».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што большая частка калектыву — маладыя спецыялісты, і гэта самы наглядны паказчык дабрабыту і перспектыўнасці прадпрыемства.

«Перакананы, немалая заслуга ў гэтым і вашага кіраўніка Аляксандра Міхайлавіча Лапацентава — сапраўднага гаспадара, руплівага і мудрага кіраўніка», — дадаў беларускі лідар.

Прэзідэнт адзначыў, што жыццё аграгарадка напоўнена дзіцячым смехам, працаваць тут імкнуцца многія гараджане, а іх дзеці, атрымаўшы адукацыю, вяртаюцца з горада дадому.

«І гэта сведчыць не толькі аб высокім узроўні ўмоў працы і быту вяскоўцаў, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Хутчэй, гэта адлюстраванне сапраўднага патрыятызму. І выхоўваецца ён на асабістым прыкладзе бацькоў. У вашым выпадку — на прыкладзе пакалення, якое стварыла гэтую вытворчасць на гэтай зямлі, у прыгожым і ўтульным кутку, куды заўсёды хочацца вярнуцца».

На думку Прэзідэнта, такі працоўны подзвіг натхняе на новыя здзяйсненні, бо нельга перапыніць справу, распачатую бацькамі.

Ён падзякаваў калектыву за прафесіяналізм, вернасць найлепшым традыцыям земляробства, умацаванне аўтарытэту і прэстыжу прафесіі аграрыя. Беларускі лідар таксама адзначыў, што сваёй працай работнікі СВК забяспечваюць не толькі ўстойлівае развіццё прадпрыемства, але і харчовую бяспеку краіны.

На завяршэнне за значны ўклад у развіццё сельскагаспадарчай галіны, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў калектыву работнікаў бялыніцкага сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Калгас «Радзіма» была аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка падарыў прадпрымству аўтамабіль Geely Atlas.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

■ Парламенцкі дзённік

Адна гульня і мноства пытанняў

Спікер ніжняй палаты беларускага парламента прапанаваў план, як зарабіць на чэмпіянаце свету па хакеі, які прымуць Мінск і Рыга ў 2021 годзе.

Пытанні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, рэгіянальнага ўзаемадзеяння, падрыхтоўкі да чэмпіянату свету па хакеі абмеркаваў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** на сустрэчы з латвійскай парламенцкай дэлегацыяй. Спікер адзначыў, што наша краіна адкрытая для шырокага супрацоўніцтва па многіх кірунках, якія ўяўляюць цікавасць і для Латвіі.

У сваю чаргу **старшыня Камітэта па абароне, унутраных справах і прадухіленні карупцыі Сейма Айнарс ЛАТКОЎСКІС** адзначыў актывізацыю ўзаемадзеяння ў барацьбе з нелегальнай міграцыяй і кантрабандай. Таксама ён лічыць неабходным працягваць умацоўванне кантактаў на розных узроўнях. Акрамя таго, падчас размовы парламентарыі закранулі ход падрыхтоўкі да чэмпіянату свету па хакеі, які ў 2021 годзе прымуць Мінск і Рыга. Уладзімір Андрэйчанка адзначыў, што дзвюм краінам неабходна абмеркаваць падрыхтоўку дарожнай інфраструктуры і прыдарожнага сэрвісу. «Мы павінны на гэтым зарабіць, паказаць імідж Беларусі і Латвіі. Магчымасці ў нас такія ёсць», — дадаў старшыня Палаты прадстаўнікоў. Таксама ён прапанаваў парламентарыям двух бакоў зрабіць канкрэтны план работы, які б дапамог кропкава вырашаць пытанні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, рэгіянальнага ўзаемадзеяння, умацавання гуманітарных кантактаў.

У час сустрэчы было адзначана станоўчае развіццё супрацоўніцтва ў інвестыцыйнай сферы. Латвійскі бізнес летась інвеставаў каля $125 млн у эканоміку краіны. Старшыня Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў, што ў Беларусі і Латвіі яшчэ шмат перспектыўных кірункаў для ўзаемадзеяння і парламентарыі павінны прымаць удзел у іх развіцці.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

ПАМЁР МІКАЛАЙ ДЗЕМЯНЦЕЙ

Учора стала вядома, што памёр былы старшыня Вярхоўнага Савета БССР Мікалай Іванавіч Дземянцей. У 1990—1991 гадах Мікалай Дземянцей узначальваў Вярхоўны Савет БССР. Пад яго старшынствам Вярхоўны Савет 27 ліпеня 1990 года прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР. У 1996—2000 гадах ён быў членам Савета Рэспублікі.

Мікалай Іванавіч Дземянцей нарадзіўся ў 1930 годзе ў вёсцы Хотліна Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці. У 1959 годзе скончыў Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію (БСГА), у 1964 годзе — Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС. З 1952 года быў на выкладчыцкай, гаспадарчай і партыйнай рабоце ў Віцебскай вобласці. У 1970—1974 гады — інспектар, з 1977 года — загадчык сельскагаспадарчага аддзела, у 1979—1989 гадах — сакратар ЦК КПБ. У 1989—1990 гадах быў старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, намеснікам старшыні Вярхоўнага Савета СССР, членам Савета Федэрацыі СССР. Аўтар кнігі ўспамінаў «Урокі жыцця».

Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю Мікалая Іванавіча ДЗЕМЯНЦЕЯ, старшыні Вярхоўнага Савета БССР 12-га склікання, і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю старшыні Вярхоўнага Савета БССР 12-га склікання, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 1-га склікання Мікалая Іванавіча ДЗЕМЯНЦЕЯ і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

Мікалай Іванавіч назаўсёды застанецца ў нашай памяці як відны дзяржаўны дзеяч, які ўнёс вялікі ўклад ва ўмацаванне беларускай дзяржаўнасці.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю старшыні Вярхоўнага Савета БССР 12-га склікання Мікалая Іванавіча ДЗЕМЯНЦЕЯ і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

Мікалай Іванавіч назаўжды застанецца ў нашай памяці як значны дзяржаўны дзеяч, які ўнёс вялікі ўклад ва ўмацаванне беларускай дзяржаўнасці.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю Мікалая Іванавіча ДЗЕМЯНЦЕЯ, старшыні Вярхоўнага Савета БССР 12-га склікання, члена Савета Рэспублікі, і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю старшыні Вярхоўнага Савета БССР 12-га склікання Мікалая Іванавіча ДЗЕМЯНЦЕЯ і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

■ Прыёмная кампанія

АБІТУРЫЕНТЫ, НА СТАРТ!

12 ліпеня распачынаецца прыём дакументаў у ВНУ. Каб вызначыцца з выбарам, у абітурыентаў ёсць усяго шэсць дзён. Прыёмныя камісіі будуць прымаць дакументы з 12 да 17 ліпеня. У гэтыя тэрміны вызначыцца з выбарам спецыяльнасці павінны ўсе абітурыенты, якія прэтэндуюць на бюджэтныя месцы, а таксама абітурыенты, якія паступаюць на платную форму навучання на спецыяльнасці, дзе прадугледжаны ўступныя іспыты.

Ад абітурыентаў, якія паступаюць на платнай аснове, але не здаюць уступныя экзамены ў ВНУ, дакументы будуць прымацца:

з 12 да 31 ліпеня — у Акадэміі МУС, Магілёўскім інстытуце МУС, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС;

з 12 ліпеня да 2 жніўня — у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў;

з 12 ліпеня да 4 жніўня — ва ўсіх іншых установах вышэйшай адукацыі.

Тэрміны падачы дакументаў для выпускнікоў профільных класаў педагагічнай накіраванасці, якія паступаюць на педагагічныя спецыяльнасці пасля праходжання гутаркі, — з 12 да 14 ліпеня (як для асоб, якія паступаюць на «бюджэт», так і на платнай аснове).

А **з 18 ліпеня** распачынаюцца ўступныя выпрабаванні, якія праводзяцца непасрэдна ва ўстановах адукацыі. Маюцца на ўвазе экзамены па творчасці, фізічнай культуры, а таксама экзамены для абітурыентаў, якія паступаюць на аснове сярэдняй спецыяльнай адукацыі на скарочаныя тэрміны навучання. Уступныя іспыты арганізаваны толькі ў адну сесію: як для асоб, што паступаюць за кошт сродкаў бюджэту, так і на платнай аснове.

А напярэдадні стала вядома, колькі ж абітурыентаў атрымала сёлета на цэнтралізаваным тэсціраванні максімальныя балы. Па інфармацыі Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў, 100 балаў набралі 392 абітурыенты, прычым 16 з іх набралі сотню балаў адразу па двух вучэбных прадметах. Такім чынам, былі аформленыя 408 стабальных сертыфікатаў. Найбольшая колькасць стабальных вынікаў была на ЦТ па матэматыцы — 155. А вось тры стабальныя сертыфікаты сёлета не ўдалося атрымаць нікому з абітурыентаў. Сярэдні бал на ЦТ па рускай, беларускай, англійскай мовах, матэматыцы і гісторыі Беларусі аказаўся вышэйшы, чым у папярэднім годзе.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ШВЕЙЦАРЫЯ АДКРЫЛА СПРЭЧКУ Ў СГА Ў СУВЯЗІ З ПОШЛІНАМІ ЗША НА СТАЛЬ І АЛЮМІНІЙ

Швейцарыя пачала працэдуру вырашэння спрэчак у рамках Сусветнай гандлёвай арганізацыі ў сувязі з увядзеннем Злучанымі Штатамі пошлін на сталь і алюміній, паведамляюць інфармагенцтвы.

У міністэрстве эканомікі Швейцарыі заявілі, што ўведзеныя ЗША пошліны неабгрунтаваныя. Згодна з правіламі СГА, у ЗША ёсць 60 дзён для ўрэгулявання спрэчкі. Пасля ў Швейцарыі будзе права вынесці гэтае пытанне на разгляд калегіі суддзяў. Раней аналагічную працэдуру ініцыявала Расія. Падобныя іскі таксама падалі Кітай, Еўрасаюз, Індыя, Канада, Мексіка і Нарвегія.

У КІЕВЕ СОТНІ ШАХЦЁРАЎ ПІКЕТУЮЦЬ ВЯРХОЎНУЮ РАДУ

Некалькі сотняў шахцёраў дзяржаўных вуглездабывальных прадпрыемстваў Украіны ў аўторак пікетавалі Вярхоўную Раду, патрабуючы пагашэння даўгоў па зарплаце і ўнясення змяненняў у дзяржбюджэт для фінансавага забеспячэння вугальнай галіны.

У руках мітынгоўцы трымалі плакаты «Галодны шахцёр — ганьба Украіны», «Спыніце знішчэнне вугальнай галіны!», «Пара дзейнічаць!», «Падтрымку вугальнай галіне!». Гарнякі стукалі каскамі па бруку і металічнай агароджы, якая аддзяляла іх ад плошчы перад украінскім парламентам.

Акрамя таго, шахцёры патрабуюць адправіць у адстаўку міністра энергетыкі Ігара Насаліка.

АСАБІСТЫ КІРОЎЦА ТРАМПА ПАДАЎ НА ЯГО Ў СУД

Былы персанальны кіроўца прэзідэнта ЗША Дональда Трампа Ноэль Сінтран звярнуўся з іскам у суд, у якім запатрабаваў кампенсацыі за тое, што кампанія Trump Organization на працягу некалькіх гадоў не аплачвала яго звышурочную работу, паведамляе Bloomberg.

Сінтран працаваў на Трампа на працягу больш як 25 гадоў. За ўвесь гэты час, па словах мужчыны, ён працаваў па 50—55 гадзін на тыдзень. Між тым, паводле заканадаўства ЗША, калі чалавек працуе больш за 40 гадзін на тыдзень, то за кожную лішнюю гадзіну яму павінны плаціць па стаўцы ў паўтара раза большай за стандартную.

Па ацэнцы Сінтрана, Trump Organization павінна яму выплаціць кампенсацыю за 3700 гадзін звышурочнай працы за апошнія шэсць гадоў. Выплат за астатнія гадзіны перапрацоўкі ён патрабаваць не можа з-за тэрміну даўніны.

ШЭДЭЎР У ПАДАРУНАК

Фестываль у Віцебску пачынае здзіўляць

Сенсацыяй, напэўна, можна назваць тое, што гораду падарылі скульптуру «Вяртанне блуднага сына» славутага земляка Восіпа Цадкіна. Гэта адбылося ў панядзелак, у першы неафіцыйны дзень міжнароднага фэсту мастацтваў. Скульптура, набытая пазалетась на аўкцыёне Christie's для карпаратыўнай калекцыі ААТ «Белгазпрамбанк», прадстаўлена ў музеі гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча.

Падчас прэзентацыі першага выставачнага праекта «базару» куратар калекцыі Аляксандр Зіменка агучыў журналістам прыемную навіну. Твор мастацтва застанецца ў горадзе. Дзе яго ўсталююць у Віцебску? Пакуль не вырашана. Але, канешне, ён стане яшчэ адной нагодай пабываць тут падчас турыстычнага вандравання.

Скульптуру, адлітую ў пачатку 1960-х пры жыцці аўтара, і яшчэ адну — «Малая П'ета», а таксама карціны «Трое аголеных за сталом» і «Возера» паказваюць на выстаўцы твораў, якія раней у Віцебску не бачылі...

Сёння, 11 ліпеня, другі дзень конкурсу юных выканаўцаў. Беларус Арцём Скароль, што цікава, выйдзе на сцэну пад нумарам 13. Хлопчык у размове з журналістамі сказаў, што гэта яго не пужае. Хацеў выступіць не першы і не апошні, таму і рады... Паколькі па традыцыі пасля

Фота БелТА.

выступленняў дзяцей ацэнкі, якія яны атрымалі ад членаў журы, не агучваюць, інтрыга трымаецца да апошняга.

Афіцыйнае адкрыццё «Базару» заўтра, 12 ліпеня. Сярод удзельнікаў афіцыйнай цырымоніі адкрыцця дзясяткі зорак, якія парадуюць публіку ў Летнім амфітэатры. Як у мінулыя гады, такі канцэрт, паводле слоў арганізатараў, стане яскравай падзеяй, якая запомніцца надоўга. Па традыцыі білеты на гэтае шоу раскупляюць у першую чаргу, як і на закрыццё «базару».

Віцебск жыве звыклым для яго фестывальным жыццём. Вулічныя кавярні працуюць практычна круглыя суткі, ветлівыя гараджане заўсёды гатовыя падказаць гасцям, куды лепш схадзіць, дзе пасядзець за кавай — такая традыцыя. Якая была, ёсць і будзе.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

УСЕ ДАКЛАДЫ ПРЫНЯТЫЯ

У рамках падрыхтоўкі да правядзення II Еўрапейскіх гульняў у Мінску праходзіць семінар шэфаў місій і прэс-сакратароў нацыянальных алімпійскіх камітэтаў

Праграмамі мерапрыемстваў прадугледжаны шэраг прэзентацый па розных функцыянальных кірунках, наведванне спартыўных аб'ектаў і кансультацыі з экспертамі. Прадстаўнікі 49 камандаў, якія прымуць удзел у II Еўрапейскіх гульнях, на працягу трох дзён убачаць прэзентацыі па акрэдытацыі афіцыйных удзельнікаў гульняў, спартыўнай праграме, сістэме кваліфікацыі, заявачнай кампаніі, размяшчэнні ў Студэнцкай вёсцы, транспартнай сістэме, інфармацыйных тэхналогіях і іншых кірунках.

«Галоўная задача для нашых гасцей на семінары — атрымаць праўдзівую інфармацыю аб усіх спартыўных аб'ектах, месцах пражывання і размяшчэння дэлегацый, акрэдытацыі і лагістычных асаблівасцях. Пра ўсё гэта мы расказвалі на пасяджэнні ў НАК Беларусі», — дзеліцца **дырэктар фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Георгій КАТУЛІН.** Беларускі бок як арганізатар прадстаўляе на семінары справаздачы аб рабоце па асобных кірунках. Рэакцыя шэфаў місій станоўчая — усе даклады прынятыя. *«Нам важная ацэнка экспертаў, якія прадстаўляюць свае краіны, іх практычныя парады і меркаванні дапамогуць падрыхтавацца беларускаму боку яшчэ лепш да маючых адбыцца спаборніцтваў»*, — адзначыў Катулін.

Падчас семінара кансультацыі праводзяць эксперты Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў, сярод якіх выканаўчы дырэктар Еўрапейскіх гульняў Сайман Клег, галоўны эксперт ЕАК па спорце Макіс Асімакопулас, спартыўны дырэктар ЕАК Пірс О'Калаган.

Як адзначылі ў Дырэкцыі, прадстаўнікі ЕАК у Мінску пастаянна ўдзельнічаюць у мерапрыемствах па падрыхтоўцы да турніру. Сёлета ў чэрвені адбыўся чарговы візіт членаў Каардынацыйнай камісіі ЕАК пад кіраўніцтвам Спіраса Капраласа, у маі прайшоў семінар для прадстаўнікоў федэрацый і менеджараў спартыўных аб'ектаў. Тэхнічныя дэлегаты міжнародных федэрацый па відах спорту рэгулярна правяраюць арэны будучых спаборніцтваў. А сёння пачнецца яшчэ адзін семінар для прэс-сакратароў НАК і вядучых СМІ Еўропы.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

■ Энергетычная бяспека

СТРЭС-ТЭСТЫ ПАЦВЕРДЗІЛІ НАДЗЕЙНАСЦЬ НАШАЙ СТАНЦЫІ

Праверка паказала, што «атамка» будзе працаваць пры гарачыні ў плюс 50 градусаў, вытрымае 50-метровую паводку і 7-бальны землятрус

Айчынная атамная электрастанцыя ўстойлівая да ўзнікнення надзвычайных сітуацый, падобных той, што адбылася на АЭС «Фукусіма», паведаміла на брыфінгу ў БелТА **начальнік Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы МНС (Дзяржатамнагляд) Вольга ЛУГАЎСКАЯ.**

На фарміраванне плана — тры месяцы

Стрэс-тэсты — гэта, па сутнасці, пазапланавая мэтавая праверка адносна ўстойлівасці атамнай электрастанцыі да экстрэмальных знешніх уздзеянняў: землятрусаў, затапленняў, складаных умоў надвор'я. Разглядалася ўстойлівасць да з'яў, якія гіпатэтычна магчымыя на тэрыторыі Беларусі: моцных вятроў і дажджоў, шквалаў, смерчаў, буйнога граду, пыльных бур, моцных завей, абледзянення, туману, засух, а таксама да камбінацый гэтых з'яў.

Наша краіна падрыхтуе нацыянальны план дзеянняў па ўзмацненні бяспекі Беларускай АЭС. Гэты дакумент будзе сфарміраваны ў тым ліку з улікам рэкамендацый па выніках партнёрскай праверкі стрэс-тэстаў станцыі, адзначыла Вольга Лугаўская.

«Хутчэй за ўсё, за тры месяцы план будзе падрыхтаваны. Зразумела, што будзе яшчэ ўздымацца пытанне кансультацый з Беларускай атамнай электрастанцыяй, бо шляхі рэалізацыі рэкамендацый могуць быць розныя», — адзначыла Вольга Лугаўская. Начальнік дэпартамента заявіла, што рэгулюючы орган раней распрацаваў дарожную карту па падрыхтоўцы і фарміраванні плана — як будуць выконвацца ўнутраныя рэкамендацыі па выніках стрэс-тэстаў, а таксама як будуць улічаныя вынікі партнёрскай праверкі.

Не перашкодзіць дадатковы аналіз

Калі разгледзець прапановы па выніках партнёрскай праверкі, то многія з іх утрымліваюць просьбу правесці дадатковую аналітычную работу. Напрыклад, Дзяржатамнагляду варта разгледзець вынікі імавернаснага аналізу бяспекі і забяспечыць выкананне адпаведных мер па ўзмацненні бяспекі. Вольга Лугаўская звярнула ўвагу, што ў рамках ліцэнзійнага працэсу БелАЭС дакумент аб такім аналізе ўжо сёння з'яўляецца абавязковым.

Па выніках стрэс-тэстаў у нацыянальным дакладзе былі сфармуляваны некаторыя рэкамендацыі для эксплуатуючай арганізацыі па ўзмацненні бяспекі, і еўрапейскія партнёры ў сваёй справаздачы аб праверцы таксама раілі ўлічыць іх. «Рэкамендацыі з'яўляюцца безумоўным вынікам любой партнёрскай праверкі. Гэтая працэдура і арганізоўваецца, каб атрымаць рэкамендацыі і забяспечыць перманентнае павышэнне бяспекі нашай станцыі», — дадала Вольга Лугаўская.

Беларусь у 2016 годзе добраахвотна правяла стрэс-тэсты АЭС з улікам спецыфікацыі Еўрапейскай групы рэгулюючых органаў па ядзернай бяспецы (ENSREG). Нацыянальны даклад па выніках стрэс-тэстаў быў накіраваны ў Еўракамісію і размешчаны ў адкрытым доступе ў інтэрнэце ў 2017 годзе, асноўная выснова — Беларуская АЭС устойлівая да ўзнікнення падзей, падобных тым, што адбыліся на «Фукусіме» ў 2011 годзе.

Справаздача ў цэлым пазітыўная

Падчас правядзення партнёрскай праверкі стрэс-тэстаў нашу краіну сёлета ў сакавіку наведала ўпаўнаважаная ENSREG група з 17 экспертаў з рэгулюючых органаў у сферы ядзернай і радыяцыйнай бяспекі. У яе складзе таксама былі прадстаўнікі Еўракамісіі, у якасці назіральнікаў — прадстаўнікі МАГАТЭ, Расіі і Ірана. Справаздача аб партнёрскай праверцы ў цэлым носіць пазітыўны характар. Яна падкрэслівае розныя добрыя практыкі і прапануе будучыя патэнцыйныя паляпшэнні ў кантэксце забеспячэння бесперапыннага павышэння бяспекі.

Фота БелТА.

Наступная місія — у кастрычніку

Нашы спецыялісты ўжо ў кастрычніку прымуць місію МАГАТЭ па аварыйнай гатоўнасці і рэагаванні (місія EPREV), паведаміў на брыфінгу **начальнік аддзела камунікацый і грамадскай інфармацыі Дзяржатамнагляду Алег СОБАЛЕЎ**. «Гэта будзе місія EPREV па ацэнцы аварыйнай гатоўнасці і рэагаванні. Да ўводу Беларускай АЭС краіна будзе прымаць яшчэ некалькі місій МАГАТЭ», — адзначыў Алег Собалеў.

Начальнік аддзела Дзяржатамнагляду звярнуў увагу, што краіны па сваім жаданні запытваюць тую ці іншую місію МАГАТЭ, і Беларусь актыўна ўзаемадзейнічае з арганізацыяй. Так, для ацэнкі адпаведнасці стандартам міжнароднай бяспекі наша краіна ў апошнія два гады запытвала і прымала місіі агенцтва IRRS і SEED. Эксперты не толькі сфармулявалі рэкамендацыі, але і выдзелілі добрыя практыкі, якія могуць быць укаранёныя іншымі краінамі.

Будзе працаваць нават пры мінус 50

Кіраўнік дэпартамента адзначае, што землятрус з'яўляецца адным з магчымых фактараў знешняга ўздзеяння, якія ацэньвалі беларускія эксперты. Па выніках комплекснага імавернаснага аналізу, максімальная інтэнсіўнасць землятрусу ў раёне пляцоўкі станцыі — 6 па шкале MSK (не блытаць са шкалой Рыхтэра), што вызначана ў якасці «праектнага землятрусу» для станцыі. Разам з тым рэактарныя ўстаноўкі спраектаваны такім чынам, каб выключыць верагоднасць аварыі і бяспечна вытрымаць нават вельмі малаверагодны землятрус інтэнсіўнасцю 8 па шкале MSK (інтэнсіўнасць у 7 балаў вызначана для «максімальнага разліковага землятрусу» АЭС).

Што датычыцца магчымых затапленняў, то, хоць паводкі ў раёне размяшчэння пляцоўкі АЭС немагчымыя (для гэтага вада павінна падняцца на 51,5 м вышэй за гістарычны максімум), станцыя вытрымае нават такі ўзровень затаплення. Аналіз і наступнае мадэляванне паказалі, што ў выпадку гіпатэтычнай паводкі і затаплення памяшканняў АЭС, якія размяшчаюцца ніжэй за ўзровень зямлі, пагроза для рэактара адсутнічае.

Нават у выпадку самых экстрэмальных умоў надвор'я (якія ўзнікаюць раз у 10 000 гадоў), такіх як павышэнне тэмпературы паветра да плюс 50 градусаў і паніжэнне да мінус 50 градусаў, або смерч з хуткасцю да 62 м/с, або нават у выпадку камбінацыі гэтых двух катаклізмаў аварыі не здарыцца, бо меры бяспекі, прадугледжаныя для абароны ад іншых уздзеянняў (затапленне, землятрус), дастатковыя для самых экстрэмальных умоў надвор'я.

Беларуская АЭС будуецца па тыпавым расійскім праекце АЭС-2006 новага пакалення «3+» каля Астраўца (Гродзенская вобласць). Першы энергаблок плануецца ўвесці ў эксплуатацыю ў 2019 годзе, другі — у 2020-м.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Здарэнні

ДЗІЦЯ ЗАГІНУЛА ПАМІЖ П'ЯНЫМІ БАЦЬКАМІ

У Брэсце загінула двухмесячнае дзіця. Яго бацькі паклалі спаць малое на канапе паміж сабой. Праўда, перад гэтым яны добра выпілі.

А калі прачнуліся праз некалькі гадзін, хлопчык не падаваў прыкмет жыцця. Яны выклікалі хуткую дапамогу, але медыкам заставалася канстатаваць смерць. Паводле інфармацыі **афіцыйнага прадстаўніка ўпраўлення Следчага камітэта па Брэсцкай вобласці Дзмітрыя ІВАНЮКА**, у крыві бацькі было выяўлена каля праміле алкаголю, у маці — яшчэ больш. Вядзецца праверка здарэння. Некалькі гадоў таму ў Брэсце быў падобны выпадак, тады адна нецвярозая маці паклала малое сабе пад бок, яно задыхнулася.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ЗА СЕКУНДУ ДА ТРАГЕДЫІ

У панядзелак на мінскай вуліцы Маршала Лосіка разыгралася драма.

Каля сямі гадзін вечара жыхары аднаго з дамоў выпадкова ўбачылі, як з акна кватэры на сёмым паверсе вылазіць хлопчык. У нейкі момант малы павіс над бязданню, ухапіўшыся за падаконнік. Але сіл надоўга не хапіла, і хлопчык паляцеў уніз... На шчасце, некалькі мужчын-відавочцаў паспелі разгарнуць пад вокнамі пакрывала, на якое ён і прызямліўся. Сіла ўдару была настолькі моцная, што пакрывала парвалася. Па звестках Міністэрства аховы здароўя, зараз пяцігадовы хлопчык знаходзіцца ў цяжкім, але стабільным стане ў РНПЦ дзіцячай хірургіі.

Следчы камітэт праводзіць праверку па гэтым выпадку. Прызначана судова-медыцынская экспертыза. Папярэдне ўстаноўлена, што малы расце ў шматдзетнай сям'і, якая зусім нядаўна пераехала ў новабудоўлю. Акно ў іх кватэры не абсталявана дадатковым запорам.

Валяр'ян ШКЛЕННІК

■ Ёсць праблема

УДЫХ ГЛЫБОКІ. РУКІ — ШЫРАЙ!

Чаму вытворчая гімнастыка стала пражыткам мінулага

Хто застаў савецкія часы, памятае, як у 11 гадзін па ўсесаюзным радыё пачыналася трансляцыя вытворчай гімнастыкі. Прыемны голас дыктаркі агучваў практыкаванні, якія трэба выканаць, каб размяць апорна-рухальны апарат, атрымаць прыліў бадзёрасці.

Мільёны працаўнікоў па ўсёй вялікай краіне ўставалі з рабочых месцаў, пад кіраўніцтвам штатнага альбо пазаштатнага інструктара выконвалі комплекс нескладаных практыкаванняў. І пераставала ныць спіна, ішоў прыток крыві да розных участкаў цела. У неабходнасці такой фізкультмінуткі ніхто не сумняваўся, ніхто не ставіць пад сумненне карысць фізічных практыкаванняў і цяпер. Дык ці ад той спадчыны мы адмовіліся?

СПАЧАТКУ БЫЎ ІНСТРУКТАР

З месяц таму давялося пабываць на пінскім трыкатажным прадпрыемстве «Палессе». Некалі — знакаміты ў палескім рэгіёне гігант лёгкай прамысловасці, цяпер ААТ таксама не апошні ў горадзе вытворца і пастаўшчык. Прадпрыемства зараз перажывае не самыя лепшыя часы, знаходзіцца ў стадыі дасудовага аздараўлення і паступова выходзіць з крызісу. Абсалютная большасць работнікаў — жанчыны, многія занятыя ў швейным і іншых цэхах, дзе прадугледжана сядзячая работа. Генеральны дырэктар «Палесся» Таццяна Лукіна сказала тады, што яны падбіраюць кандыдатуру інструктара па спорце і разглядаюць магчымасць укаранення вытворчай гімнастыкі. Зараз, роўна праз месяц, намеснік гендырэктара Людміла Шмат паведаміла карэспандэнту, што такі чалавек падабраны, для яго знайшлі палову стаўкі ў штатным раскладзе, але ён будзе займацца спартыўна-масавай работай. Яна запэўніла, што на прадпрыемстве будуць разглядаць магчымасць укаранення вытворчай гімнастыкі.

ПАГАЛОЎНАЯ АПТЫМІЗАЦЫЯ

Застаецца спадзявацца, што на «Палессі» зробяць добрую справу на карысць здароўя работнікаў. Тут хоць разглядаюць магчымасць, не адмаўляюць таго, што актыўны перапынак патрэбны супрацоўнікам.

На жаль, прыкладу таго, што названая гімнастыка ўвайшла ў практыку вытворчага працэсу, адшукаць на Брэстчыне не ўдалося. Хіба што наадварот. Напрыклад, на вядомым баранавіцкім баваўняным аб'яднанні, таксама гіганце савецкіх часоў, нядаўна скасавалі чвэрць стаўкі спартыўнага інструктара. Зроблена гэта, вядома, у парадку аптымізацыі ў спадзяванні, што фінансавыя справы пойдуць лепей. Але ці выратуе рэнтабельнасць прадпрыемства гэтая чвэрць стаўкі? Як вядома, апошнім часам дзяржава ўкладвала вялікія сродкі ў мадэрнізацыю названага вытворцы баваўняных тканін. Сродкі выдзялялі найперш для таго, каб захаваць калектыў і прадпрыемства ў горадзе. А калектыў — гэта яго людзі з іх здароўем і працаздольнасцю, што асабліва актуальна цяпер, калі пенсійны ўзрост паступова расце.

Наш абласны цэнтр вызначаецца мноствам вялікіх і малых прыватных прадпрыемстваў па пашыве жаночага адзення. І ў горадзе, і ў Брэсцкім раёне такіх фірмаў і фірмачак — дзясяткі. Дырэктару аднаго такога прадпрыемства Уладзіміру Хілько я і патэлефанавала са сваім пытаннем. Вытворчасць у «Бурвіна» салідная: 250 работнікаў, большасць з іх жанчыны, нармальная зарплата, прыстойны сацыяльны пакет. «Чаго няма, таго няма», — адказаў Уладзімір Васілевіч на пытанне і пажартаваў: калі зрабіць перапынак на гімнастыку, то што застанецца нашым дзяўчатам на перакур? Потым назваў факт, які вельмі непакоіць: ледзь не большая палова маладых жанчын фабрыкі курыць, што, вядома, не самым лепшым чынам уплывае на іх здароўе. Дык можа, варта на гэтым прадпрыемстве ўшанаваць тых, хто не выходзіць на перакуры, менавіта карыснай для здароўя гімнастыкай? Напрыклад, у той час, калі іх калегі глытаюць дым? Дырэктар абяцаў падумаць над прапановай.

ТОЛЬКІ БІЗНЕС

У кантэксце гэтых разважанняў праглядваюцца дзве праблемы. Першая — нежаданне кіраўніцтва траціць хоць бы мінімальныя сродкі і намаганні на працэс аздараўлення членаў калектыву. Тым больш што ніхто не прымушае гэта рабіць. У савецкія часы вытворчая гімнастыка пачалася з пастановы ўрада, якая была прынятая ў красавіку 1930 года. А пастановы тады выконвалі, спачатку нібы пад прымусам, потым — па прывычцы. Добрай прывычцы. Адразу практыкаванні рабілі пад строга патрыятычную музыку, а ў 80-х нават пад песню Высоцкага. Памятаеце: «Вдох глубокий. Руки шире. Не спешите: три, четыре!»? І рабілі гімнастыку, і ўсе былі задаволеныя. Адзін з цяперашніх маладых кіраўнікоў сказаў у неафіцыйнай гутарцы, што яму не падабаюцца нашы павольныя работніцы, каб яго воля, ён бы набраў дзяўчат з В'етнама, тыя працуюць як пчолкі, бальнічнага не просяць, пра сацыяльны пакет не згадваюць. Словам, нічога асабістага. Толькі бізнес.

Старшыня Брэсцкага абкама прафсаюзаў работнікаў лёгкай прамысловасці Ірына БАХМУЦКОВА адзначыла:

— Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі не раз спрабавала адрадзіць забытую традыцыю вытворчай гімнастыкі. Вярнуць добрую справу хацелі нават на заканадаўчым узроўні, але замацаваць норму заканадаўча не ўдалося. Звычайна парламентарыі гаварылі, што работнікі заўсёды могуць «націснуць» на кіраўніцтва і правесці гэты радок праз калектыўны дагавор. Тэарэтычна гэта правільна, а на практыцы мы бачым, што адбываецца. Мне шкада, але я не ведаю такога прадпрыемства нашай галіны ў рэгіёне, дзе б праводзілі вытворчую гімнастыку.

ЧАС ВЫПРАЎЛЯЦЬ ПАМЫЛКІ

Сапраўды, у такой сітуацыі і самі работнікі, скажам, праз прафкамы, маглі б дзейнічаць больш рашуча і настойліва. Гэта другая праблема. Калі для сябе яны адстойваюць хвіліны для перакураў, то маглі б пры жаданні адстаяць карысную для здароўя справу. Але нашы людзі наогул не вельмі прывыклі клапаціцца пра сваё здароўе. Гэта таксама факт. Значыць, здаровы лад жыцця і ўсё, што з ім звязана, трэба прасоўваць рашуча і настойліва з дапамогай грамадскасці альбо пэўных дзяржаўных інстытутаў. **Галоўны пазаштатны спецыяліст па лячэбнай фізкультуры галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Брэсцкага аблвыканкама Уладзімір ПЕРШУКЕВІЧ** сказаў:

— Мы добраахвотна адмовіліся ад найважнейшага мерапрыемства, накіраванага на захаванне здароўя. 10—15 хвілін, выдзеленыя на фізічныя практыкаванні, не зробяць шкоды вытворчаму працэсу, а для здароўя людзей была б вялікая карысць. Хваробы пазваночніка, канечнасцяў цяпер маладзеюць. Выдаткі на лячэнне работніка непараўнальныя са стратамі вытворчасці ад хвілін на гімнастыку. Чамусьці ў нас на гэта зусім мала звяртаецца ўвагі. Што казаць пра бізнес, калі многія ўстановы аховы здароўя скарачаюць штаты спецыялістаў ЛФК. Такія рашэнні лічу глыбока памылковымі. Памылкі ж рана ці позна давядзецца выпраўляць.

Святлана ЯСКЕВІЧ

...МОКРЫ НОС І СТРЭСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Кінолаг нясе сутачнае дзяжурства разам са сваім сабакам. Але пры неабходнасці ён можа браць на дапамогу і другога чатырохногага памочніка. Напрыклад, абваліўся дом, выехаў кіналагічны разлік. І сабака як быццам бы кагосьці знайшоў. Калі ў кінолага ўзнікаюць сумненні, ці ёсць нехта пад завалам, то ён выпусціць другога сабаку ў якасці кантрольнага.

Увогуле, калі сабака паступае на службу, то яго стартавы ўзрост складае ад трох да шасці месяцаў. Шчаня павінна прайсці даволі складаны тэст. Па-першае, абавязкова ўлічваецца радаслоўная. Калі нехта з «бацькоў» ужо служыць у кінолагаў, то шанцы, што ў малога сабакі будзе адпаведная генетыка, павялічваюцца. Па-другое — характар. Калі шчанюк выказвае агрэсію, то яго адбракуюць тут жа. Нашы сабакі павінны быць дружалюбнымі, паколькі іх задача — дапамагаць тым, хто трапіў у бяду. Затым іх чакае ветэрынарны агляд. Яго задача — выявіць, каб у жывёлы не было ніякіх адхіленняў у фізічным развіцці. А вось пасля мы шчанюка тэстуем на палахлівасць. На яго надзяваюць спецыяльную амуніцыю, падвешваюць за яе на вышыню і назіраюць за рэакцыяй. Навошта гэта патрэбна? Справа ў тым, што мы можам вылецець на верталёце і дэсантавацца ў любы пункт краіны. У такім выпадку сабака спускаецца ў звязцы з кінолагам з вышыні прыкладна ў 50 метраў. Таксама нашы памочнікі не павінны баяцца тэхнікі, выбухаў, гуку працуючых інструментаў... Проста яны працуюць непасрэдна з кінолагам і ўвагу звяртаюць выключна на яго.

І калі шчаня паспяхова прайшло ўсе тэсты, то пачынаецца перыяд яго навучання, які доўжыцца сама меней год.

Працоўны век сабакі ў кіналагічным разліку не вельмі доўгі — да васьмі гадоў. Рэкордны ўзрост, у якім нёс службу наш чатырохногі памочнік, складаў 12 гадоў. Старажылу цэнтра Оскару ўжо сем. Усе іншыя яго «калегі» маладзейшыя.

Калі сабака дасягнуў «пенсійнага» ўзросту, то ствараецца спецыяльная камісія. Яна робіць ветэрынарны агляд, правярае фізічны стан і тэстуе жывёлу на вынослівасць. Напрыклад, работа сабакі на завале доўжыцца 30 хвілін. Калі наш хвастаты памочнік стамляецца пасля 15—20 хвілін працы — значыць, ён ужо не можа выконваць сваю функцыю на ўсе сто. Але спісанне з работы не азначае, што ад сабакі адмаўляюцца. Як правіла, кінолаг сабаку забірае да сябе дадому. Яны ж гадамі складаюць адно цэлае — кіналагічны разлік. Гэта твой напарнік, з якім ты нясеш службу, у якога ўкладваеш шмат сіл. Самі сабакі таксама за гэты час моцна прывязваюцца да кінолага. І што ж, пасля ўсё гэта перакрэсліць і здрадзіць сябру?

— А ў вас дома ёсць сабака?

— Так, але не лабрадор, а такса. Мая напарніца Айса, з якой працую, вельмі маладая, ёй усяго паўтара года. Зусім нядаўна яна «скончыла» спецыялізаваны курс падрыхтоўкі, а паступіла да нас з кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл.

Сёлета кінолагі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях выязджалі тройчы на месцы здарэнняў, звязаных з абвальваннем будаўнічых канструкцый.

— Сабаку трэба заахвочваць, — дзеліцца сакрэтамі Ігар Апановіч. — Таму, калі ён знаходзіць чалавека, — ці то на вучэннях, трэніроўцы, ці то ў рэальнай абстаноўцы, — сабака атрымлівае прыз у выглядзе смачнага пачастунку або цацкі. Агулам жа мы можам працаваць без перапынку на завалах да трох сутак. Але па жорсткім рэгламенце — разлікі змяняюцца праз кожныя паўгадзіны.

Аднак каб адшукаць чалавека пад завалам, патрэбны доўгія і працяглыя трэніроўкі. На кожны дзень у кінолагаў складзены план заняткаў са сваім гадаванцам. Акрамя практыкаванняў на двухсотметровай паласе перашкод непасрэдна на базе нашай службы, мы выязджаем на вучэнні і на будоўлі, і ў лес. Здараюцца і кур'ёзныя выпадкі: мы акрэслілі межы ўчастка, умоўныя пацярпелыя схаваліся ў траве, — і тут аднекуль з'яўляецца іншы чалавек. Натуральна, да яго падбягае сабака і пачынае брахаць, пакуль не падыдзе кінолаг. А пасля аказваецца, што гэта грыбнік...

Але большасць выездаў у спецыялістаў звязана з мірнымі мэтамі. Напрыклад, у Дзіцячым рэабілітацыйным цэнтры для дзяцей-інвалідаў кінолагі — даволі частыя госці. Малым з асаблівасцямі развіцця патрэбна догатэрапія.

— Наколькі ў службовых сабак адчувальная розніца паміж «хлопчыкамі» і «дзяўчынкамі»?

— «Хлопчыкі» больш вынослівыя. Але ў гэтага медаля ёсць і адваротны бок. Яны больш актыўныя, часам замест трэніроўкі хочуць пагуляць, ды і ўвогуле патрабуюць большай увагі. А вось з «дзяўчынкамі» працаваць прасцей. Яны больш пакладзістыя і адданыя кінолагу. Зрэшты, як і ў людзей, тут усё індывідуальна.

* * *

Хутка кінолагі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях займеюць адну цікавую тэхналагічную навінку. На ашыйнікі сабак, якія займаюцца пошукамі зніклых у лясах, будуць прымацоўвацца адмысловыя GPS-трэкеры. Яны стануць перадаваць сігналы на навігатары кінолагаў, куды запампуюць вельмі падрабязныя карты. Такім чынам, кінолаг у лесе не будзе арыентавацца выключна на брэх сабакі (які пры гэтым можа адбегчы і на дзясятак кіламетраў), а паглядзіць на патрэбныя каардынаты мясцовасці і пойдзе туды найкарацейшым шляхам. Такім чынам, і часу на пошукавыя аперацыі спатрэбіцца ўжо меней.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Фота атрымана ад кіналагічнай службы Цэнтра пошукава-выратавальных работ і пажаратушэння Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

■ Простая мова

ЖЫЦЦЁ — ПАСЛЯ ЖЫЦЦЯ

...Два месяцы дажджу не было! А неяк ноччу ён прыйшоў, гучна пастукаў па аконных адлівах — быццам спытаў: «Можна?». Гараджане, злыя, што пабудзіў, сказалі: «Не!» — і дождж сціх.

...Часам нешта пытацца — толькі час губляць: рабі, што трэба. І хай будзе, што будзе.

ГЭТА — ГОРАД...

Праспект, скрыжаванне, святлафор. Для патоку машын загараецца чырвонае, таму яны, загадзя прытармазіўшы, спыняюцца: дзве — побач.

— Алежа, здароў! — ляціць з-за руля адной.

Пасажыр другой апускае шкло:

— Міша?! Здароў.

— Як жывы? Як жонка, дзеці?

— Усё пуцём. А ў цябе?

— Таксама...

— Працуеш там жа?

— Там. Куды я з падводнай лодкі...

— А ты?

— І я... Прывітанне тваім...

— І ты перадай.

На гэтым размова завяршаецца, бо на святлафоры — жоўтае, потым зялёнае: машыны кранаюцца з месца, едуць, губляюцца ў патоку іншых.

Каб потым некаму прывезці прывітанні — ад Мішы і Алежы, каб сказаць, што ўбачыліся (?) у горадзе, што паразмаўлялі (?)... І што ў абодвух «усё пуцём».

«ПОМНІК»

«Паздымалі дзеўкі боты — стала воку больш работы». Гэта — на пачатку вясны, калі пацяплела. На пачатку лета, калі пагарачэла, яны, тыя дзеўкі (ды і хлопцы) паздымалі з сябе ці не ўсё: голыя амаль ногі, рукі, грудзі, спіны... Глядзеў бы і глядзеў, бо там — яшчэ і «малюнкі»: недзе — невялічкія, сціплыя, можа, нават прыгожыя, недзе, на жаль...

А зрэшты, што ні галава, то розум: захацеў чалавек вось гэта насіць, дык няхай сабе носіць: мода цяпер на розныя татуіроўкі ды і грошы, падобна, ёсць...

У Ніначкі яны таксама былі.

І мода была: тады — на залатыя ўсмешкі.

Каб займець яе, дзеўка нікога не паслухала: усе пярэднія, здаровыя, досыць прыгожыя зубы «абпілавала» і ў свае 22 надзела на іх залатыя каронкі.

Не без таго — ёй самой гэта падабалася і яна нейкі час пафарсіла (хоць і пастарэла гадоў на 15), а потым...

Дзень пры дні, гадамі, нават дзесяцігоддзямі баялася лішні раз усміхнуцца, у незнаёмай кампаніі слова сказаць — страшэнна камплексавала!

Дык каронкі ж хоць можна зняць, паставіць іншыя.

Тату застанецца — помнічкам...

Толькі модзе?

ЛЕВАЙ... ЗА ПРАВАЕ...

— Алё, даведка? Я вас не чую...

Гэта — на ўвесь трамвай — нейкая цётка. Яна сядзіць ззаду і па мабільным расказвае той «даведцы», што хацела «пакласці» грошы на свой тэлефон (далей — доўгі нумар), а паклала на чужы (зноў з дзясятак лічбаў); пытаецца, як зараз «зняць».

Жанчыне, падобна, расказваюць, тая слухае, але разумее (ці чуе?) далёка не ўсё: некалькі разоў перапытвае, дзякуе, зноў і зноў тэлефануе...

Пасажыраў, падобна, «дастаў» гэты доўгі працэс «перамоў». Нават спачуваючы жанчыне, яны не разумеюць, чаму б ёй не пазваніць напрасткі — атрымальніку грошай? Чаму б не сказаць, што я, маўляў, варона — памылілася, «кінула» грошы на ваш нумар, дык вы ўжо, калі ласка, — «скіньце» на мой...

Просты шлях? Ды часам не наш: нам трэба нейкім абходным, кружным — левай рукой за правае вуха, з «тылу».

ЗА ПАРОГАМ

...Раней у гэту невялічкую кавярню мы зазіралі, можна сказаць, часцяком. Каля стойкі выбіралі нешта з напіткаў-наедкаў, плацілі грошы і, пачуўшы добразычлівае «Займайце столік — мы ўсё прынясём», уладкоўваліся ў мяккіх крэслах.

Нядоўга чакалі, хвілін праз пяць нам і праўда ўсё прыносілі, прычым хораша: каву — у белых пузатых кубачках, чай — у імбрычках, прысмакі, цукар і лыжачкі — на сподачках — як-ніяк, Еўропа...

З надыходам вясны, з пацяпленнем сталы там накрываюць на вуліцах.

У Мінску, што прыемна, ужо таксама: на адмысловых верандах, з туйкамі-кветкамі, з цёплымі пледамі...

Аднак туды (і ў прыватнасці, з той кавярні) усё заказанае ды аплачанае (дарэчы, па тых жа не нізкіх цэнах) нам выносяць у... танных аднаразовых кубачках, без ніякага цукру і сподачкаў-лыжак.

Трэба разумець, каб не скралі?

І больш сюды не прыходзілі.

КАБ ПАЧУЛІ...

Чужы ўспамін.

Бацька гоніць самагонку. Сын зрэдчас зазірае да яго, пытае, колькі нацякло. А недзе апоўначы прыходзіць, каб дапамагчы спарадкаваць апарат.

На стале бачыць поўнае вядро. Бацька з яго здымае пробу і сыну дазваляе памачыць палец і потым аблізаць. Самагонка цёплая і пахне хлебам. «Нясі паперу. Паглядзім, як гарыць», — гаворыць бацька і дастае запалкі. Сын мочыць паперу, падносіць да агню. Самагонка капае і гарыць «сінім полымем». «Вось так і вантробы будуць гарэць», — кажа бацька... Свайму дзіцяці.

А хочацца — каб усім!

«МЫ АДКАЗНЫЯ...»

У сваячкі «валочка» зямлі — пад садам, бульбай, кустамі парэчак, кветкамі, цяпліцамі, градкамі з морквай, капустай, цыбулькай, бурачкамі...

Вады ў спёку прасіла ўсё (два месяцы без дажджоў), а таму на змярканні гаспадыня выцягвала шланг — паліва-ла... Уяўляла, як пры гэтым круціцца лічыльнік, амаль «чула», як сварыцца муж: шкада грошай. Ды раслінак — яшчэ «шкадней»: мы ж адказныя «за тое, што пасадзілі»?

НЕ СЫШЛІСЯ?

Дыялогі... Тут і зараз — два.

Першы: вечар, плошча, прыпынак. Мы з сяброўкай на ім «раз'язджаемся», дзве дарослыя дзеўкі — толькі сустрэліся.

— Я ж табе сказала: нармальна адзенься, — адразу налятае першая, — а ты?

— Што я? У мяне толькі гэта чыстае, — на джынсы з майкай паказвае другая.

— Дык твая маці што — зусім таго (палец каля скроні)? Адзежу табе не мые?

— Не.

...І ў метро нейкіх хлопцаў набілася: ледзь не ў кожнага — заплечнік, «які належыць» яму, — за плячыма. У вагон з-за іх у выніку — не зайсці, не ўціснуцца!

— Вы б знялі... Хоць тут... І што ў іх вазіць?! — абураюцца пасажыркі.

— А я вам (гэта — дыялог другі) скажу, — даверліва абяцае старэйшая.

І сапраўды расказвае, як ёй на паўгода прапісалі дарагія лекі, як яна, каб купіць, узяла на кватэру студэнтаў, як тыя (усе трое з розных месцаў) у пакеты, у сумкі-заплечнікі складвалі брудныя... шкарпэткі, майкі, трусы.

Хлопцу з Міншчыны бруднае мыла мама — прыязджала разоў колькі на месяц. Двое другіх вазілі яго дамоў.

...Праўду кажуць: ніхто не знае, што каго чакае. Цалкам магчыма, што вось гэтых хлопцаў лёс звядзе з тымі дзеўкамі, што іх жа — потым — загс развядзе. Чаму?

Яны скажуць: справа ў характарах.

А калі папраўдзе?

Не ў шкарпэтках?

АРЫФМЕТЫКА

Не было ў сям'і кансэнсусу: Іванавіч у якасці лецішча хацеў хату на хутары, жонка ягоная — дом у вёсцы. У выніку сама на машыне сто сёл абгойсала, але ж знайшла што хацела. Мужу сказала: «Альбо тут, альбо ніколі». Яму, значыць, толькі і заставалася, што згадзіцца, аформіць куплю. Праўда, перад тым не раз прайсціся па вуліцы, паглядзець на сялібы, павітацца з людзьмі, налічыць аж 15 хат — жылых (ён казаў «жывых»). Не без таго — трапляліся там і «мёртвыя» (з забітымі вокнамі-дзвярыма, з зарослымі быльнягом садамі), але тое зрэдку...

Хата, якую прыдбалі яны, была з такіх жа — вымагала працы і грошай...

На рамонт яе тры гады пайшлі.

Толькі тры, здавалася б, але за гэты час вёска стала... хутарам.

Што, вядома ж, не радуе, нават Іванавіча, хоць дом там ён, як быццам, хацеў?

ЁСЦЬ ТАКАЯ ПАСЛУГА

На дзвярах пад'езда вясной абвестка з'явілася: «Узару агарод, скашу траву». Ніжэй — нумар тэлефона: трэба разумець, мужа на час... Толькі больш шырокага профілю.

І нарэшце (бо тэлефоны ўсе абарваныя).

ЖЫЦЦЁ — ПАСЛЯ ЖЫЦЦЯ

Позняя раніца — пусты трамвай: сядай, дзе хочаш, чытай...

Нешта не дае: нехта стаіць паблізу... Садзіцца насупраць. Падымаю вочы, каб паглядзець, і міжволі «апускаю» сківіцу: на мужчыне (не з маладых) — вышыванка: чорная, з кароткім рукавом, з вузкай аздобленай стоечкай замест каўнерыка, з неглыбокім разрэзам на грудзях, абапал якога вышыты (самым драбнюткім крыжыкам!) яркі жывы арнамент...

«Носьбіт» яго ўжо прывык, відаць, да такіх вось захопленых позіркаў да пытанняў. А таму апярэджвае: паклаўшы руку на арнамент, кажа кароткае: «Мама...» Дадае: «Светлай памяці...» Глядзіць у акно.

Далей мы едзем моўчкі, як быццам паасобку і ў той жа час — разам: ужо ўтраіх.

Валянціна ДОЎНАР

■ Ну і ну!

ВЯЗЕНЬ ЛАЎКІ

Якім чынам гамяльчанін трапіў у такое няёмкае становішча, ён сам не змог расказаць — па прычыне прыкметнага алкагольнага ап'янення.

Выцягнуць яго з лаўкі спачатку паспрабавалі два мінакі. Аднак мужчыны хутка зразумелі, што могуць нанесці толькі шкоду, і выклікалі прафесійных ратавальнікаў. Супрацоўнікі МНС распілавалі драўляныя рэйкі і такім чынам вызвалілі нецвярозага грамадзяніна.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

Продается производственное здание в г. Краснополье, ул. Советская, 101. Площадь 1081,9 кв. м.

Прилегающая территория заасфальтирована. Материал стен – кирпич. 1968 год постройки.

Тел. +375 29 684 56 40. УНП 490426909

Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего КПУП «Оршанская типография» (УНП 300051962)

Наименование (описание) имущества и его стоимость	Лот № 1 Листоподборочно-брошюровальная линия, инв. № 2303, с установленной начальной ценой 32 371 руб.
Наличие обременений	Отсутствуют
Местонахождение имущества	г. Орша, ул. Замковая, 3
Место, дата и время проведения торгов	02.08.2018 г. в 10.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2. 4
Справочная информация об организаторе торгов	Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, www.vitebskjust.gov.by). Судебный исполнитель – Деревнин Сергей Евгеньевич, тел./факс. (0212) 61 40 08, (033) 687 91 44
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 17.00 01.08.2018. Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота). В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем)

Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего КУП «Россонское ПМС», (УНП 300434533)

Наименование (описание) имущества и его стоимость	Лот № 1. Автомобиль «САЗ 3507», 1988 г. в., регистрационный знак 6127 ВТП, кузов (рама) №XTH531400J1224354, с установленной начальной ценой 1 168 рублей. Лот № 2. Цистерна для хранения ГСМ 10 куб. м в количестве 8 шт., 1978 года выпуска, с установленной начальной ценой 1 484,80 рублей. Лот № 2. Цистерна для хранения ГСМ 25 куб. м в количестве 4 шт., 1977 года выпуска, с установленной начальной ценой 988,80 рублей
Наличие обременений	Отсутствуют
Местонахождение имущества	г. п. Россоны, ул. Лапенко, 36
Место, дата и время проведения торгов	30.07.2018 г. в 10.00, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2.4
Справочная информация об организаторе торгов	Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, www.vitebskjust.gov.by). Судебный исполнитель – Деревнин Сергей Евгеньевич, тел./факс (0212) 61 40 08, (033) 687 91 44
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BICAKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 17.00 27.07.2018. Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота). В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем)

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ТРАНСБУГ»

Предмет торгов	Начальная цена без НДС, руб.	Размер задатка, руб.
Лот № 1. Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-132093 (целевое назначение – складское помещение; наименование – изолированное помещение № 1) площадью 537,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Красногвардейская, 114Б/4-1	33 600,00	3 360,00
Лот № 2. Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-132094 (целевое назначение – складское помещение; наименование – изолированное помещение № 2) площадью 1184,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Красногвардейская, 114Б/4-2	74 500,00	7 450,00

Имущественные права на земельный участок	Право постоянного пользования
Условия продажи	Без условий
Организатор торгов	РУП «Институт недвижимости и оценки», Брестский филиал
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона
Условия оплаты	В соответствии с заключенным договором купли-продажи
Номер р/с для перечисления задатка	BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк». Региональная дирекция № 100 по Брестской обл., г. Брест, ул. Мицкевича, 10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245

Аукцион состоится 24 июля 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, а также иную информацию об объектах торгов, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 23 июля 2018 г. до 17.00

АБЯСШКОДЗІЦЬ «ЦІХАГА ЗАБОЙЦУ»

Як і навошта своечасова выяўляць узровень халестэрыну

Усе мы, здавалася б, чулі пра халестэрын і яго схільнасць выклікаць атэрасклероз сасудаў, а з ім і сардэчна-сасудзістыя захворванні. Але як своечасова выявіць у арганізме гэтага «ціхага забойцу» і ў якім узросце варта задумацца пра абследаванне? Якія фактары рызыкі дастаткова мінімізаваць, каб знізіўся артэрыяльны ціск? І што варта выдаліць з рацыёну, каб халестэрын прыйшоў у норму? Пра гэта расказала загадчык аддзялення прафілактыкі 31-й гарадской паліклінікі г. Мінска Таццяна ПЛІСЮК.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Таццяна Аркадзеўна, як вядома, высокі ўзровень халестэрыну выклікае атэрасклероз сасудаў. У якім узросце ўсім нам варта задумацца пра гэта?

— Справа ў тым, што высокі ўзровень халестэрыну ніякіх скаргаў у хворага не выклікае, таму яго і называюць «ціхім забойцам». Гэтаксама як і артэрыяльная гіпертэнзія, якую мы можам не адчуваць. У маладых жанчын падчас павышэння ціску, асабліва калі раней яны былі гіпатонікамі, могуць з'яўляцца млоснасць ці рвота і галаўны боль. Але з кожным эпізодам павышэння ціску гэтыя сімптомы затухаюць. Мы зараз праводзім акцыі «Здаровае сэрца» ў гіпермаркетах і гандлёвых цэнтрах, усіх запрашаем памераць ціск. Дык вось для многіх становіцца адкрыццём той факт, што ў іх павышаны ціск. У такім выпадку рэкамендуем вымераць яго хоць бы на працягу двух тыдняў, а затым наведаць тэрапеўта. Урач ацэньвае паказчыкі ціску, прызначае біяхімічны аналіз крыві на той жа халестэрын, накіроўвае пры неабходнасці да вузкіх спецыялістаў, акуліста, неўролага. І прызначае лячэнне. Трэба адзначыць, што спачатку мы імкнёмся ўздзейнічаць дыетай, зменшыць фактары рызыкі. Яны падзяляюцца на кіраваныя і некіраваныя. Некіраваныя — гэта ўзрост (і чым ён большы, тым вышэйшая рызыка развіцця артэрыяльнай гіпертэнзіі) і спадчыннасць. Кіраваныя фактары рызыкі — курэнне, атлусценне, у прыватнасці абдамінальнае, цукровы дыябет. Таму, як відаць, многае залежыць ад нас самі. Калі ёсць лішняя вага, трэба пастарацца пахудзець, калі курыце — кінуць. На тое, каб мінімізаваць фактары рызыкі, даецца паўгода. Калі такія меры не дапамаглі, прызначаюцца гіпатэнзіўныя прэпараты. А што да ўзросту, то часцей за ўсё ў мужчын 40—60 гадоў пачынаюцца ці ўжо існуюць праблемы: развіваецца атэрасклероз, у гэтым узросце часта здараюцца сардэчна-сасудзістыя катастрофы — інсульты, інфаркты, у тым ліку і з лятальным канцом, таму на гэтую катэгорыю мужчын медыкі звяртаюць асаблівую ўвагу.

— Што нам самім трэба рабіць, каб не прапусціць хваробу?

— Акрамя таго, што пажадана кантраляваць свой ціск, пра што я ўжо казала, важна праходзіць дыспансерызацыю. Нават тым, хто адчувае сябе абсалютна здаровым, варта прыходзіць хоць бы раз на год да тэрапеўта, здаваць асноўныя аналізы, у тым ліку біяхімічны аналіз крыві, ён прызначаецца ўсім мужчынам і жанчынам пасля 40 гадоў. Такі скрынінг вельмі важны, бо захворванне можа не адчувацца, але яно спадцішка робіць сваю справу. І калі выявіць яго на ранняй стадыі, можна яшчэ паўплываць немедыкаментозна.

— Узровень халестэрыну вызначаецца па аналізе крыві?

— Халестэрын — вельмі важны кампанент у нашым арганізме. Ёсць ліпапратэіны высокай шчыльнасці і нізкай шчыльнасці, так званы «добры» і «дрэнны» халестэрын. Лічыцца, што ліпапратэіны высокай шчыльнасці — гэта «добры» халестэрын, які збірае «дрэнны» і транспартуе яго ў печань. І чым ніжэйшы ўзровень ліпапратэінаў высокай шчыльнасці і вышэйшы ліпапратэінаў нізкай шчыльнасці, тым большая рызыка развіцця ішэмічнай хваробы сэрца і сардэчна-сасудзістай недастатковасці. Калі мы здаём аналіз крыві, то бачым лічбу агульнага халестэрыну, якая можа ні пра што не сведчыць. Важна ведаць суадносіны ліпапратэінаў высокай і нізкай шчыльнасці і трыгліцэрыдаў, так званы каэфіцыент атэрагеннасці. У некаторых пацыентаў агульны халестэрын у норме, а каэфіцыент атэрагеннасці пры норме ад 2 да 3 адзінак атрымліваецца 3,5 ці 4. Яго павышэнне да ўзроўню большага за тры адзінкі сведчыць аб тым, што ёсць рызыка развіцця атэрасклерозу — захворвання, калі сасуды забіваюцца атэрасклератычнымі бляшкамі, ускладняецца адток крыві, з-за чаго развіваюцца артэрыяльная гіпертэнзія, ішэмічная хвароба сэрца, сардэчная недастатковасць. У такім выпадку патрэбная дыета па зніжэнні халестэрыну. Людзі з высокім яго узроўнем з узростам пры адсутнасці лячэння могуць прыйсці да хранічнай сардэчнай недастатковасці. Калі дыета не дапамагае, прызначаюцца статыны — прэпараты, якія зніжаюць халестэрын.

— Нашы чытачы цікавяцца: ці падыходзіць прэпарат мілдранат пажылым людзям, якія маюць сардэчна-сасудзістыя хваробы?

— Гэта сродак, які падыходзіць усім пацыентам — як маладым, так і ўзроставым. Мілдранат — метабалічны прэпарат, які паляпшае ў тым ліку мазгавую дзейнасць, стан печані і сардэчнай мышцы. Таму ў спартсменаў ён лічыцца забароненым, бо дзейнічае як анаболік. Многія пацыенты адзначаюць павышэнне фізічнай актыўнасці на фоне яго прыёму.

— Якія прадукты зніжаюць узровень «дрэннага» халестэрыну?

— Па-першае, у рацыёне неабходна знізіць жывёльныя тлушчы, транстлушчы. Не пажадана ўжываць тлустае мяса — гусь, качку, а таксама каўбасы, паштэты, беконы. Карысныя садавіна, агародніна, ласось і іншыя тлустыя гатункі рыбы, дзе змяшчаюцца амега-3 тлустыя кіслоты. Неабходны складаныя вугляводы, а гэта збожжавыя культуры, кашы, хлеб буйнога памолу, таксама малако, але з невысокім працэнтам тлустасці, сыры. Пацыентам з атэрасклерозам сасудаў — не важна, галаўнога мозга ці сэрца — найперш рэкамендуюць дыету, хоць бы на паўгода. Яна садзейнічае зніжэнню халестэрыну. Гэтыя рэкамендацыі падыходзяць і пры артэрыяльнай гіпертэнзіі, таксама тым, хто перанёс інфаркт, інсульт, любую сардэчную катастрофу. Дарэчы, бакал сухога чырвонага віна зніжае халестэрын. Але тут важная ўмеранасць.

— Што ў спякоту павінны памятаць людзі з артэрыяльнай гіпертэнзіяй?

— У летнюю спякоту ў пацыентаў з артэрыяльнай гіпертэнзіяй крыху зніжаецца ціск, адпаведна, ім патрабуецца зніжэнне дозы гіпатэнзіўных прэпаратаў на гэты перыяд. Але тут ёсць небяспека. Некалькі гадоў таму ўсё лета стаяла гарачае надвор'е, а потым спякота раптам прайшла, і ў гэты перыяд вырасла колькасць інфарктаў і інсультаў, у тым ліку са смяротным зыходам. Справа ў тым, што пацыенты ў спякоту знізілі дозы гіпатэнзіўных прэпаратаў і, калі адбыўся скачок атмасфернага ціску, падняўся артэрыяльны ціск у хворых, а на яго фоне здарыліся сардэчна-сасудзістыя катастрофы. **Таму ў спякоту, калі хворыя адчуваюць сябе лепш, усё роўна важна не губляць пільнасці, кантраляваць ціск і не прапусціць той момант, калі зноў трэба прыняць звыклую дозу гіпатэнзіўных прэпаратаў. Хоць бы невялікую іх дозу рэкамендуецца прымаць заўсёды.**

Ваш узровень рызыкі — які ён?

У вас вельмі высокая рызыка сардэчна-сасудзістых ускладненняў, калі ваш дыягназ — ішэмічная хвароба сэрца, атэрасклероз сасудаў мозга, цукровы дыябет, хранічная хвароба нырак ці вы перанеслі інсульт. Вы адносіцеся да групы высокай рызыкі, калі маеце высокі артэрыяльны ціск і высокі ўзровень халестэрыну. У такім выпадку вам неабходная гіпаліпадэмічная тэрапія.

Як можна знізіць узровень халестэрыну?

Павышэнне фізічнай актыўнасці. Рэкамендуюцца фізічныя нагрузкі ўмеранай актыўнасці па 30—40 хвілін не менш за тры разы на тыдзень.

Здаровае харчаванне. Варта пазбягаць хлеба найвышэйшага гатунку, выпечкі з вялікай колькасцю тлушчу (бісквіты, круасаны, пірожныя), тортаў з шакаладным крэмам, бліноў, пончыкаў (смажаных піражкоў), малака, вяршкоў, плаўленых і цвёрдых сыроў з высокай колькасцю тлушчу (30 % і вышэй), узбітых вяршкоў, яечных жаўткоў, любога тлустага мяса, асабліва свініны, каўбас і сасісак, салямі, паштэтаў, беконаў, мяса качкі і гусака, смажанай агародніны, прыпраўленай сметанковым маслам, чыпсаў, сметанковага масла, свінога тлушчу, сала, цвёрдага маргарыну, усіх відаў напояў з дабаўленнем цукру.

Зніжэнне халестэрыну з дапамогай лекаў. Найбольш эфектыўнымі прэпаратамі, якія зніжаюць халестэрын, з'яўляюцца статыны. Яны зніжаюць узровень «дрэннага» халестэрыну і павышаюць узровень «добрага». Зніжэнне ўзроўню халестэрыну з дапамогай статынаў змяншае рызыку развіцця інсульту і інфаркту ў два разы, тым самым павялічваючы працягласць жыцця.

Як доўга трэба лячыцца прэпаратамі, якія зніжаюць узровень халестэрыну?

Лячэнне павышанага ўзроўню халестэрыну павінна быць доўгім і пастаянным. Не паддавайцеся спакушэнню спыніць прыём лекаў без прадпісання ўрача, нават калі ўзровень халестэрыну знізіўся да нармальных значэнняў.

Пра што раскажуць ногці

Чаму на іх з'яўляюцца белыя плямы, увагнутасці, бугры і хвалі?

Белыя плямы — гэта адна з самых частых, і, бадай, самая спрэчная скарга на ногці. Называецца такая з'ява лейканіхія. Калі вы раптам звярнулі ўвагу, што ваша пласціна на ногцях стала белаватая, змяняе колер, прычым такія перамены стойкія, то гэта можа сведчыць пра хваробы печані, часам нават вельмі цяжкія, такія, як цыроз.

У медыцынскім цэнтры ўніверсітэта штата Мэрыленд (ЗША), напрыклад, заявілі, што дробныя белыя плямы на ногцях сведчаць пра недахоп цынку ў арганізме, які надыходзіць падчас жорсткай дыеты і доўгай дэпрэсіі. А цынк сапраўды неабходны для росту і дзялення клетак, якія «выбудоўваюць» скуру, валасы і ногці. Аднак на думку іншых спецыялістаў, сувязь дэфіцыту цынку ці кальцыю з жалезам і белымі адмецінамі на ногцях надуманая. А адзіны факт, які дакладна даказаны,— што асноўная прычына белых плям — гэта механічнае або хімічнае парушэнне працэсу арагавення ногця.

Няправільны танны лак для ногцяў, танны ацэтон для яго зняцця, вузкі абутак і няправільнае выдаленне кутыкулы — вось самыя частыя прычыны з'яўлення белых плям, якія зусім і не плямы, а пузыркі паветра. Ніякага пігменту белага колеру ў ногці няма.

У якія колеры могуць пафарбавацца ногці?

Сінімі ногці робяцца не толькі ад таго, што іх прышчамілі, але яшчэ і з-за цыянозу. Прычына такая ж, як і ў выпадку, калі пальцы сінеюць на марозе: дэфіцыт кісларода, з-за чаго ток крыві замаруджваецца і падскурныя сасуды набываюць сіняватае адценне. Жаўцеюць ногці ў заядлых курыльшчыкаў. Здараецца, што ногці чырванеюць на кончыках і каля асновы, робяцца карычневымі ці набываюць зеленаватае адценне. Усім гэтым колерам што толькі не прыпісваюць: сіфіліс, абсцэс, праблемы са шчытападобнай залозай і анкалогію. Але адназначна так сказаць нельга. У здаровага чалавека ногці павінны быць раўнамерна ружовымі, а з любымі адхіленнямі варта звяртацца да дэрматолага.

Што азначаюць хвалі і ўпадзіны?

Расслаенне ногцяў найчасцей сустракаецца ў цырульнікаў, медсясцёр і прыбіральшчыц. Гэта адбываецца з-за таго, што ў іх рукі доўгі час або мокрыя, або перасушаныя. У майстроў манікюру да вільгаці дадаецца ультрафіялетавая лямпа для сушкі і агрэсіўны склад лакаў для ногцяў. А калі чалавек нічога не мые, не прыбірае, то ломкасць ногцяў



можа быць прыкметай анеміі і наступствам дэфіцыту жалеза, без якога гемаглабін дрэнна даносіць кісларод да тканак, асабліва тых, што на пальцах і далёка ад сэрца. Вертыкальныя хвалі для людзей сталага ўзросту, у якіх абменныя працэсы замаруджваюцца, з'ява нармальная, а ў больш маладых могуць быць прыкметай псарыязу, экзэмы ці артрыту. Калі ж на ногцях з'явіліся гарызантальныя ўвагнутасці і бугры, то, хутчэй за ўсё, гэта вынік стрэсу, і ваш арганізм мае патрэбу ў вітамінах ці мікраэлементах.

Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

Узровень жыцця насельніцтва — асноўны клопат

Самыя высокія заробкі на Гомельшчыне — у Рэчыцкім раёне

У Рэчыцкім раёне апошнім часам рэалізаваны шэраг інвестыцыйных праектаў, якія значна ўплываюць на развіццё Гомельскай вобласці ў цэлым. Напрыклад, у агракамбінаце «Холмеч» пабудавана малочнатаварная ферма на 1000 галоў. У КСУП «Дзяржынскі-агра» завяршаецца будаўніцтва фермы на 600 галоў дойнага статка. ААТ «Рэчыцадрэў» працягвае мадэрнізацыю вытворчасці ДСП. Тут завершана будаўніцтва завода смол, які мае стратэгічнае значэнне для прадпрыемства. РУП «ВА «Беларуснафта» рэалізаваны ў поўным аб'ёме інвестыцыйны праект па будаўніцтве самай магутнай у Рэспубліцы Беларусь фотаэлектрычнай станцыі. Рэчыцкім райжылкамгасам завершаны работы па будаўніцтве новай кацельні ў гарадскім пасёлку Зарэчча. Летась у эканоміку раёна інвеставана каля 285 мільёнаў рублёў. Пры гэтым, адзначае старшыня Рэчыцкага раённага выканаўчага камітэта Віталь ПАНЧАНКА, унёсак раёна ў аб'ём інвестыцый Гомельскай вобласці вельмі істотны — каля 10 %.

— Па большасці прагнозных паказчыкаў мы ідзём з адчувальнай станоўчай дынамікай і сёлета. Асаблівая ўвага ўдзяляецца развіццю прамысловага комплексу, дзе фарміруецца больш як 60 % выручкі ад рэалізацыі тавараў, работ, паслуг. Між тым летась тэмп росту прамысловай прадукцыі склаў 124 %. Валаўтваральныя прадпрыемствы ААТ «Речыцадрэў» і ААТ «Рэчыцкі метызны завод» паказваюць высокія тэмпы аб'ёмаў вытворчасці прадукцыі, што станоўча адбіваецца на эканоміцы рэгіёна ў цэлым. На тэрыторыі раёна паспяхова працуюць прадпрыемствы, створаныя з удзелам капіталу Аўстрыі, Кіпра, Расіі, Германіі і іншых краін. Летась у раён паступіла каля $2,8 млн прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове.

Фота БелТА.

— Відаць, усё гэта разам спрыяе і стварэнню працоўных месцаў у Рэчыцы?

— На зноў створаныя працоўныя месцы за кошт з'яўлення новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў летась было працаўладкавана 425 чалавек, за кошт пашырэння дзейнасці існуючых — 345. За першы квартал сёлета — 106 чалавек. Дарэчы, у Рэчыцкім раёне самыя высокія заробкі на Гомельшчыне. Сярэдні паказчык за чатыры месяцы года складае амаль 936 рублёў.

Рэчыцкі раён экспартуе ў 36 краін свету больш за 48 % прадукцыі, якая тут вырабляецца. Важнае значэнне для экспарту раёна мае вынік дзейнасці метызнага завода. Яго доля складае каля 83 %. Шмат работ у Расіі выконваюць супрацоўнікі ААТ «Буравая кампанія «Дэльта».

Малое прадпрымальніцтва ў Рэчыцкім раёне актыўна спрыяе фарміраванню канкурэнтнага асяроддзя, росту вытворчасці спажывецкіх тавараў, развіццю сферы паслуг, стварэнню новых працоўных месцаў. Цяпер у нас зарэгістравана 2242 суб'екты малога і сярэдняга бізнесу. У гэтай сферы занята каля 16 % насельніцтва раёна. Ад недзяржаўнага сектара ў бюджэт раёна толькі летась мы атрымалі больш 20 млн рублёў, ці звыш 20 % ад агульнай сумы паступленняў.

— І ўсё ж, асноўнай галіной эканомікі раёна была і застаецца сельская гаспадарка...

— Прагнозны паказчык па тэмпе росту вытворчасці валавой прадукцыі аграпрамысловы комплекс раёна сёлета забяспечыў на 108,2 % пры прагнозе 106,2 %. За студзень — красавік у сельскагаспадарчых арганізацыях Рэчыцкага раёна ў разліку на аднаго работніка памер выручкі склаў 12,1 тыс. рублёў. Гэта на 30,8 % вышэй за ўзровень 2017 года. Увогуле ж, сёлета, як і раней, будзем забяспечваць ўстойлівае развіццё тэрыторыі і павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва. Каб гэта адбывалася, трэба павышаць эфектыўнасць дзейнасці прадпрыемстваў: скарачаць выдаткі вытворчасці пры адначасовым павелічэнні аб'ёмаў выпуску. Важна імкнуцца да росту рэнтабельнасці продажаў, а таксама агульнай прыбытковасці прадпрыемстваў.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

РЭЧЫЦКІ МЕТЫЗНЫ: ГАСПАДАР ЗНОЙДЗЕ МЕСЦА КОЖНАМУ ЦВІКУ

Адкрытае акцыянернае таварыства «Рэчыцкі метызны завод» — самае буйное прадпрыемства па вытворчасці цвікоў у Рэспубліцы Беларусь, адзін з лідараў краін СНД па асартыменце спецыяльных цвікоў, а таксама адзінае прадпрыемства ў краіне, дзе ў аўтаматычным рэжыме выконваецца гарачае ацынкаванне труб.

Геаграфія паставак уключае рынкі каля 30 краін. У іх ліку — Расійская Федэрацыя, Германія, Чэхія, Аўстрыя, Бельгія, Францыя, Італія, Венгрыя, Балгарыя, Румынія, Польшча, Арменія, Казахстан, Малдова... Сёння ў краіны далёкага і блізкага замежжа адпраўляецца каля 80 % прадукцыі, якая вырабляецца на заводзе.

На сённяшні дзень завод прапануе спажыўцам больш за 1400 найменняў вырабаў розных тыпаў і памераў: цвікі будаўнічыя, машынныя, спецыяльныя; шрубы; вінты; высокатрывалыя балты; гайкі; заклёпкі; шплінты; шпількі; восі спецыяльныя; дрот агульнага прызначэння, зварачны, для арміравання жалезабетону і для халоднай высадкі; гарачаацынкаваныя водагазаправодныя і электразварныя трубы.

Сучаснае абсталяванне ў цэху гарачага цынкавання дазваляе наносіць звышстойлівае антыкаразійнае пакрыццё на канструкцыі даўжынёй да 12,5 метра і вагой да васьмі тон. Дзякуючы гэтаму значна павялічваецца тэрмін жыцця дэталяў. Зараз на Рэчыцкім метызным цынкуюць усё: ад балтоў да бэлек. У велізарную ванну з расплаўленым да 500 градусаў цынкам апускаецца каркас будаўнічай канструкцыі. Праз некалькі хвілін яна на паверхні ўжо ацынкаваная і бліскучая.

На ўчастку крапежнага цэха (КЦ2), які мае сучаснае тэхналагічнае абсталяванне, сёлета ўрачыста адзначана важнае дасягненне: брыгада Аляксея Іванчанкі летась выпрабіла 3000 тон крапяжу. Начальніку крапежнага цэха Сяргею Гураву і ўсім членам брыгады дырэктар завода Віктар Самончык уручыў Падзячны ліст і падарункі. Увод гэтага аб'екта дазволіў прадпрыемству значна павялічыць вытворчасць крапяжу. Цяпер за суткі тут яго вырабляецца больш за 10 тон. Дарэчы, да гэтага была праведзена вялікая работа па атрыманні сертыфікацыі міжнароднага стандарту IATF 16949:2016.

— Мы адно з тых прадпрыемстваў у Беларусі, якія паспяхова прайшлі сертыфікацыю на адпаведнасць гэтаму міжнароднаму стандарту якасці, — адначае **дырэктар Рэчыцкага метызнага завода Віктар САМОНЧЫК.** — Размова ідзе пра сістэму менеджменту якасці для вытворчасцяў аўтамабільнай прамысловасці і арганізацый, якія вырабляюць адпаведныя сэрвісныя часткі. Мы доўга да гэтага ішлі. Патрабаванні былі вельмі высокія, таму многа давялося зрабіць і ўпарадкаваць дакументальна.

На прадпрыемстве распрацаваны, укаранёны і сертыфікаваны сістэма менеджменту якасці, а таксама сістэмы кіравання аховай працы і навакольным асяроддзем. Больш чым 93 % прадукцыі маюць сертыфікаты адпаведнасці патрабаванням ТНПА (тэхнічных нарматыўных прававых актаў), дырэктывам Еўрапейскага саюза з правам нанясення маркіроўкі CE (Conformite Europeene — еўрапейская адпаведнасць).

Мадэрнізацыя шрубавага ўчастка дазволіла атрымліваць да 500 тон у месяц высокатрывалага крапяжу класа трываласці 8,8 і 10,9 і вінтоў саманаразаючых для канструкцыйных матэрыялаў ва ўсіх галінах. Гэта прадукцыя запатрабаваная на ўсіх рынках збыту і мае больш высокую дабаўленую вартасць у параўнанні са звычайным крапяжом. Цяпер на прадпрыемстве вядзецца работа па ўвасабленні ў жыццё трэцяга этапу праекта, у аснове якога ляжыць засваенне вытворчасці дахавых самарэзаў. Сёлета будзе завершана і пераўзбраенне цвіковага цэха.

— Вытворчасці цвікоў у Рэчыцы сёлета споўнілася 106 гадоў. Пачатак ёй у 1912 годзе паклалі Барыс і Уладзімір Рыкі. Тады на іх прадпрыемстве працавалі ўсяго 28 чалавек, якія выпускалі ў суткі 30 пудоў прадукцыі. Вытворчасць цвікоў дагэтуль актуальная. Цяпер у год іх выпускаюць каля 12 тысяч тон.

— Штогод завод пацвярджае званне лаўрэата ў конкурсах «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» і «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі». Кожныя пяць гадоў заводу прысуджаецца прэмія ўрада за ўкараненне высокаэфектыўных метадаў кіравання якасцю і забеспячэнне на гэтай аснове выпуску канкурэнтаздольнай прадукцыі.

* * *

Лозунг над цэнтральнай прахадной «Мой завод — мой гонар» сведчыць пра стаўленне дзвюх тысяч метызнікаў да свайго прадпрыемства. На ім, тым часам, не забываюць пра абарону эканамічных, сацыяльных, працоўных інтарэсаў работнікаў. Высілкі прафсаюзнага камітэта накіраваны на паляпшэнне ўмоў жыцця, удасканаленне аплаты працы, забеспячэнне поўнай і прадукцыйнай занятасці, сацыяльных гарантый, адзначае **старшыня прафкама Аляксандр КАРПЕКА:**

— Прафсаюзны камітэт удзяляе ўвагу развіццю спартыўна-аздараўленчай, фізкультурнай і культурна-масавай работы. Калектыў прадпрыемства з году ў год выходзіць пераможцам раённай круглагадовай спартакіяды сярод прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў Рэчыцы і раёна. Актыўна на заводзе праводзіцца культурна-масавая работа.

УНП 400024166.

■ Сельскагаспадарчая арыфметыка

ДВА ЎКОСЫ ЗА СЕЗОН

забяспечаць якаснымі бялковымі кармамі статак у калгасе «50 гадоў Кастрычніка»

Малочнатаварны комплекс «Іванішча».

Штодзень з калгаса (СВК) «50 гадоў Кастрычніка», што ў Рэчыцкім раёне, на перапрацоўчыя прадпрыемствы Гомельшчыны адпраўляецца 34,5 тоны малака. Калі ўявіць, што гаспадарка мае толькі 5 тысяч га сельгасугоддзяў, гэта вельмі многа. Буйной рагатай жывёлы тут 6200 галоў. Дойны статак — 1675. Сельскагаспадарчую матэматыку растлумачвае старшыня праўлення Рыгор ШПАКАЎ, які нязменна кіруе гаспадаркай амаль паўстагоддзя:

Рыгор Шпакаў — заслужаны работнік сельскай гаспадаркі рэспублікі, ганаровы грамадзянін Рэчыцкага раёна. У 1969 годзе быў абраны старшынёй праўлення калгаса «50 гадоў Кастрычніка», якім нязменна кіруе 49 гадоў. Адзначаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і «Знак Пашаны».

— Гэта значыць, на 100 га прыходзіцца каля 120 галоў. Канешне, гэта добра, але рэальна і 150. Дарэчы, каля 70 % нашага малака рэалізоўваецца гатункам «экстра» — за самы высокі закупны кошт. У месяц ад малака мы атрымліваем Br700 тысяч. Калі зможам больш павялічыць нарыхтоўку малака і мяса, значыць, яшчэ палепшым сваё фінансавае становішча. Малако — гэта ж штодзённае паступленне грошай. Для ўсіх, хто працуе ў калгасе, — гэтыя лічбы ўрэшце ператвараюцца ў заробак.

На зарплату ніводны з 250 супрацоўнікаў калгаса не скардзіцца. Сярэдняя складае запаветную тысячу рублёў, а рэальная ў тых, хто працуе з добрай аддачай, — куды вышэйшая.

— Да асноўнай зарплаты мы выплачваем яшчэ адну — стымулюючую, — расказвае Рыгор Купрыянавіч. — Таму некаторыя атрымліваюць даткова да Br3 тысяч. Гэта дае магчымасць матываваць тых людзей, хто працуе эфектыўна, не парушае тэхналогію і дысцыпліну. І крадзяжоў у нашай гаспадарцы няма, бо ніхто ж не хоча пазбавіцца тых выгод, што мае.

Па выніках працы за мінулы год СВК «50 гадоў Кастрычніка» чарговы раз занесены на дошку гонару Гомельскай вобласці.

Цэнтр калгаса — вёска Левашы, знаходзіцца за 25 км ад Рэчыцы. Населенаму пункту больш за 500 гадоў. Назва ж гаспадаркі — «50 гадоў Кастрычніка» — адносіцца да новай гісторыі, і ёй тут таксама ганарацца. Дадаюць, што вельмі важна захоўваць тое добрае, што стваралі іх бацькі столькі гадоў запар:

— Наша вытворчасць юрыдычна лічыцца прыватнай, а фактычна гэта калектыўная гаспадарка, — расстаўляе акцэнты Рыгор Шпакаў. — Таму што тут кіруе калектыў, а кіраўнік нясе адказнасць перад людзьмі. Народ заўсёды больш разумны, чым кіраўнік. Начальнік павінен слухаць кожнага чалавека і нават сваю думку выказваць як калектыўную. Важна, каб кожны член калектыву шчыра лічыў: гэта мой калгас.

Механізатар Павел СУРТА, электрагазазваршчык Аляксандр КУРЫЛЕНКА і механізатар Андрэй СТАРАЖЭНКА.

Супрацоўнікі так і лічаць. Яны шчыра ўсміхаюцца, калі гавораць пра сваю нялёгкую працу на зямлі. І з задавальненнем фатаграфуюцца каля кветнікаў і фантанаў, якія на фермах і мехдварах упрыгожваюць чысцюткую тэрыторыю калектыўнай гаспадаркі.

Тут прынята разлічваць толькі на свае сілы: замест крэдытаў пад вялікі працэнт — рацыянальнае стаўленне да фінансаў. Пры гэтым, калі для справы трэба абнаўленне машынна-трактарнага парка, на неабходнай тэхніцы і абсталяванні не эканомяць. Тут ствараюць вытворчыя памяшканні сваімі сіламі. Гэта таксама дае значную эканомію рэсурсаў.

Ну а кармы для жывёлы нават у самы засушлівы год тут не купляюць. На гэты выпадак кароўкі ўжываюць нарыхтаваныя загадзя запасы. Тэма кормanарыхтоўкі асабліва актуальная і гэтым засушлівым летам.

Над тым, чаго, колькі і дзе сеяць, у калгасе «50 гадоў Кастрычніка» думаюць загадзя ўсе спецыялісты гаспадаркі. Плануюць тут галоўным чынам тыя культуры, якія дадуць максімальны па колькасці і якасці вынік. Зараз значная ўвага люцэрне, а таксама крыжакветным — яны маюць высокія спажывецкія якасці. Рыгор Шпакаў гаворыць, што міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід Заяц даручыў яму прыгледзецца да магілёўскага вопыту:

— Два гады таму міністр зрабіў нам заўвагу, што адсутнічае ў рацыёне нашай жывёлы свірэпіца, — адзначае Рыгор Купрыянавіч. — Мы прааналізавалі сітуацыю і цяпер выкарыстоўваем вопыт майго сябра Аляксандра Лапацентава — кіраўніка СВК «Калгас «Радзіма», што ў Бялыніцкім раёне на Магілёўшчыне. Сэнс тэхналогіі — у атрыманні ўласнага таннага раслiннага бялку. Выгаду мы падлічваем не на этапе нарыхтоўкі, а праз жывёлагадоўлю, калі атрымліваем эканамічную эфектыўнасць, якая выяўляецца ў павелічэнні ўдояў і прыбаўленняў у вазе. Большы выхад прадукцыі пры меншых выдатках — у гэтым і крыецца ўся эканоміка. Тым больш развіццё жывёлагадоўлі немагчымае без паўнавартаснага рацыёну, насычанага бялком і вугляводамі. Што яшчэ важна: ранні тэрмін уборкі такіх кармоў. Свірэпіца ў сумесі з паўкосным жытам даюць магчымасць збіраць два ўраджаі: кармавая сумесь скошваецца ў пачатку мая і адразу ж вызваляюцца плошчы пад зернебабовыя ці пад кукурузу. Такі падыход не патрабуе вялікіх выдаткаў у тым ліку на мінеральныя ўгнаенні і сродкі абароны раслін. Мы плануем пад аналагічныя пасевы і надалей павялічваць плошчы. У канцы жніўня пасеем вялікую колькасць свірэпіцы.

Рыгор Шпакаў гаворыць, што свой шматгадовы вопыт у сельскай гаспадарцы ён пастаянна падмацоўвае набыццём новых ведаў. А ўсімі дасягненнямі абавязаны людзям, з якімі працуе:

— У нас практычна ўсе кадры працуюць доўгі час. Мы супрацоўнікаў не шукаем — яны да нас прыходзяць і просяцца на работу. Важна працаваць сумленна і ніколі не спыняцца на дасягнутым.

УНП 400036941.

Узровень жыцця насельніцтва — асноўны клопат

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Фота БелТА.

Рэчыцкі раён — адзін з самых буйных у Гомельскай вобласці. Яго плошча — каля 2700 квадратных кіламетраў.

Насельніцтва раёна складае каля 98 тысяч чалавек.

Горад Рэчыца заснаваны на месцы селішча племені дрыгавічоў на гандлёвым шляху з «варагаў у грэкі». Першы раз згадваецца ў Гусцінскім летапісе пад 1213 годам.

Сапраўднай вялікай падзеяй для Рэчыцы і раёна стала адкрыццё ў 1964 годзе Рэчыцкага радовішча нафты. На тэрыторыі Палескай упадзіны адкрыта 61 радовішча нафты.

• У Рэчыцкім раёне — 82 установы адукацыі. Па выніках 2017—2018 навучальнага года атэстаты асобага ўзору з узнагароджаннем залатым і сярэбраным медалём атрымалі 32 навучэнцы.

• У 2018 годзе спартсменам раёна прысвоена: 2 званні майстра спорту Рэспублікі Беларусь, 3 званні кандыдатаў у майстры спорту Беларусі, 26 спартсменаў раёна ўключаны ў нацыянальныя каманды Рэспублікі Беларусь.

• У Рэчыцкім раёне — 80 установ культуры. Сёлета выхаванцы школ мастацтваў сталі пераможцамі і прызёрамі 56 конкурсаў і фестываляў музычнага і выяўленчага мастацтва, заваявалі больш за 300 узнагарод.

Фота БелТА.

Славутасці Рэчыцкага раёна

УСПЕНСКІ САБОР

Будаўніцтва гэтага сабора пачалося ў 1841 годзе і толькі ў 1864-м зноў аднавілася. У 1872 годзе ён быў дабудаваны і асвячоны. У 1934 годзе сабор закрылі, а яшчэ праз некалькі гадоў ператварылі ў «Дом сацыялістычнай культуры». Сабор застаўся без купалаў, яго інтэр'ер быў цалкам зменены, да храма прыбудавалі драўляны будынак. У 60-я гады памяшканне стала безгаспадарным. Толькі ў 1999 годзе сабор вярнулі вернікам. Цяпер Успенскаму сабору прысвоены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларусі. Ён ганарыцца сваім іканастасам, які пяціярусны, уключае дваццаць чатыры абразы. У 2011 годзе ў храме з'явіліся два кіоты ў гонар святога Мікалая і Казанскай Божай Маці.

ТРОІЦКІ КАСЦЁЛ

Сёння ён уяўляе яркі прыклад неагатычнай архітэктуры пачатку XX стагоддзя. Упершыню каталіцкі касцёл у Рэчыцы быў пабудаваны ў 1634 годзе. Храм упрыгожваў горад да 1756 года, калі быў пабудаваны новы драўляны Троіцкі касцёл і манастыр пры ім. У 1842 годзе рэчыцкія дваране падалі просьбу пра будаўніцтва новага — мураванага — касцёла на тым жа месцы. Але будаўніцтва было завершана толькі ў 1903 годзе.

Троіцкі сабор ведаў розныя часы. У гады савецкай улады будынак выкарыстоўваўся ў якасці склада, электрастанцыі, піўной, вітамінnага бара. У 1998 годзе касцёл прызналі помнікам архітэктуры XX стагоддзя і ўключылі ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. У 1999 годзе яго вярнулі вернікам. Цяпер касцёл з'яўляецца адным з упрыгожанняў горада.

ВАЖНА ДУМАЦЬ ПРА БУДУЧЫНЮ

У дзясятцы найлепшых у краіне па выніках першага квартала апынулася Дзяржаўная вопытная лесагаспадарчая ўстанова «Рэчыцкі вопытны лясгас» Гомельскага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання. Калі ўлічыць, што год таму сярод 98 лясгасаў краіны прадпрыемства займала толькі 64 месца, гэта — значны прарыў.

— Усе прамысловыя паказчыкі ў нас ідуць з тэмпамі росту да адпаведнага перыяду мінулага года 180—200 %, — гаворыць **дырэктар Дзмітрый ГЛУСЦОЎ.** — Сярэдні заробак вырас значна. Па выніках пяці месяцаў ён складае ўжо 1010 рублёў.

Цяпер лясгас знаходзіцца ў стадыі актыўнага развіцця. Практычна паўсюль ідуць рэканструкцыя, рамонт будынкаў, мадэрнізуецца вытворчасць. Дарэчы, у структуру дзяржаўнай вопытнай лесагаспадарчай установы ўваходзіць шэсць лясніцтваў: Баршчоўскае, Бела–Балоцкае, Зарэчанскае, Мілаградскае, Рэчыцкае, Ровенска–Слабодскае. Яшчэ не паўсюль завершаны рамонты, але ўжо заўважна, што кожны з будынкаў, як і тэрыторыі навокал, маюць свае прыцягальныя адметнасці.

Паляванне з Wi-Fi

Галоўны ляснічы Рэчыцкага вопытнага лясгаса Дзмітрый Давыдзенка паказвае мілае сэрцу Белабалоцкае лясніцтва. На працягу апошняга дзесяцігоддзя ён ім кіраваў і даводзіў да ладу. Лясніцтва самае аддаленае ад райцэнтра, але ж 30 км на машыне — не такая ўжо і адлегласць. Цяпер тут адпампоўваюць першы мёд гэтага года. Ляснік і пчаляр па сумяшчальніцтве Аляксандр Хлебаказаў даглядае пяць дзясяткаў сем'яў пчол.

Калі заехаць на ўсход глыбей у лясы, якія можна лічыць запаведнымі, трапляеш у паляўнічую гаспадарку. Яна знаходзіцца каля вёскі Пескаполле, у маляўнічым месцы на левым беразе Дняпра. Будынак паляўнічага дамка ў хваёвым бары — двухпавярховая раскошная сядзіба. Там створаны ўсе ўмовы, каб з камфортам адпачыць пад спевы птушак. Ну, а калі трэба разабраць здабытую на паляванні дзічыну, вопытныя егеры дапамогуць гэта зрабіць у асобным прыстасаваным памяшканні.

Крыху нечакана сустрэць у такім аддаленым ад цывілізацыі кутку сучаснае збудаванне з усімі выгодамі. У драўляным палацы, разлічаным на размяшчэнне 14 чалавек — двух- і трохмесныя пакоі са зручнай мэбляй, хол са сталом для більярда, камінам і тэлевізарам, кухня з сучасным абсталяваннем, лазня, раскошныя канапы і, канешне, Wi-Fi.

Экстрым да крыніцы давядзе

Здаецца, зусім хутка пра гэта месца даведаюцца і маладыя прыхільнікі вострых адчуванняў. Нядаўна тут, на агароджанай добраўпарадкаванай тэрыторыі, на прыгожых узгорках быў абсталяваны вяровачны парк. У яго два ўзроўні. Вопытны інструктар правядзе дзяцей па першым «паверсе» і падстрахуе дарослых, якія захочуць прайсці выпрабаванні на другім, больш складаным і вышэйшым узроўні.

Адсюль жа пачынаецца дзесяцікіламетровая экалагічная сцежка. Яна пракладзена ўздоўж Дняпра. За час экскурсіі можна азнаёміцца з асноўнымі пародамі дрэў, імхамі, іншымі раслінамі, насякомымі, птушкамі... Між тым у вёсцы Чорнае, дзе заканчваецца экалагічная сцяжынка, у 1885 годзе нарадзіўся беларускі пісьменнік і навуковец Міхайла Грамыка. Гэта менавіта ён першы знайшоў нафту ў Рэчыцкім раёне і напісаў п'есу «Скарынін сын з Полацка» і многія іншыя. Ён жа апублікаваў у 1920-я гады на беларускай мове падручнікі «Пачатковая геаграфія» і «Уводзіны ў навуку пра неарганічную прыроду».

У той жа вёсцы Чорнае больш за 100 гадоў існуе крыніца, да якой сёння з'язджаюцца праваслаўныя вернікі. Дарэчы, менавіта з дапамогай супрацоўнікаў Рэчыцкага лясгаса была добраўпарадкавана крыніца і абсталяваны спецыяльныя купальні для таго, каб кожны асабіста адчуў гаючыя якасці мясцовай вады.

Пітомнік.

У леса ёсць вочы

Зразумела ж, галоўнымі кірункамі дзейнасці лясгаса з'яўляецца стварэнне, вырошчванне і ахова лясоў. Ажыццяўляць правільнае карыстанне лясным багаццем перашкаджаюць час ад часу парушальнікі. Але і на іх сёння ёсць управа. Да аховы лесу прыцягваецца фотатэхніка, якая фіксуе нелегальных лесасекаў і тых, хто кідае смецце.

Партатыўныя камеры спецыялісты ўсталёўваюць непасрэдна на дрэвах. Апаратура дазваляе зафіксаваць твары браканьераў і нумары іх машын. Пакуль грамадзянін грузіць ссечаныя дрэвы ў аўто, яго перасоўванні ў анлайн-рэжыме транслююцца на пульт лясной аховы. Пры затрыманні, нават калі злодзеі разбягаюцца па лесе, цяпер нескладана даказаць, хто вінаваты ў незаконных дзеяннях. Пасля чаго парушальнікаў чакае буйны штраф. Выпадкі такія ўжо ёсць — адпаведныя пратаколы складзены праваахоўнікамі і накіраваны для разбіральніцтва ў суд. Фотапасткі, упэўнены ў Рэчыцкім лясгасе, дапамагаюць не толькі ў барацьбе з высечкай лясоў, але і са стыхійнымі звалкамі.

Дырэктар ДВЛУ «Рэчыцкі вопытны лясгас» Дзмітрый ГЛУСЦОЎ.

За лесам пільна наглядаюць і са спецыяльных вежаў, дзе таксама ўсталявана відэаапаратура. У летні пажаранебяспечны час гэта дазваляе своечасова выявіць узгаранні і прыняць усе меры, каб прыпыніць распаўсюджванне агню. Нягледзячы на тое, што цяпер забаронена наведванне лясоў, прыхільнікі пасмажыць на прыродзе шашлык знаходзяцца. Вось таму ляснічы Станіслаў Якуш так уважліва ўглядаецца ў манітор.



Ляснічы Белабалоцкага лясніцтва Станіслаў ЯКУШ сочыць за пажарнай бяспекай.

Дуб замест хвоі

Толькі шкада, што няма пакуль дзейснага сродку супраць біялагічнага пажару. Так супрацоўнікі Рэчыцкага лясгаса называюць пашкоджанне лясоў кузуркамі-караедамі: вяршынным і шасцізубым. Дарэчы, летась ад невялічкага, але пражэрлівага шкодніка ў Рэчыцкім лясгасе загінула хвоя на плошчы звыш 600 га. На гэтай тэрыторыі былі праведзены суцэльныя санітарныя высечкі. Сёлета выяўлена ўжо 980 га, з'едзеных ардой кузурак, з іх распрацавана на гэты момант 640 га.

— Нават, калі своечасова паспяваем і высякаем пашкоджаныя дрэвы, не дасягаем 100 % эфекту, — з горыччу гаворыць **галоўны ляснічы Дзмітрый ДАВЫДЗЕНКА.** — У той жа час, вядзецца пастаяннае аднаўленне лесапасадак. Сёлетняй вясной нам усе дапамагалі садзіць лес. Выйшлі разам і супрацоўнікі райвыканкама, і ваенныя, і ратавальнікі, і нафтавікі, і нават індывідуальныя прадпрымальнікі. Мы разам пасадзілі 406 га. Гэта значная лічба для нашага невялікага па плошчы лясгаса. Між тым прырода сама стварае ўмовы для тых культур, якія будуць лепш расці на месцы загінулых. На лесасеках, якія мы пакуль не сталі чапаць, ідзе натуральнае лесааднаўленне. Для нас саміх было нечакана пабачыць, як вялікія плошчы ўпэўнена займаюць дубы, якіх ніколі ў гэтых мясцінах раней не было.

Аксаміт амурскі знайшоў новую радзіму

Леснікі, якія цесна супрацоўнічаюць з навукоўцамі, вызначылі новую формулу, па якой пры пасадцы на 6 хваёвых цяпер прыходзіцца 4 ліственыя дрэвы. Так больш шанцаў для выжывання абедзвюх культур. Некаторыя вучоныя кажуць, што арэал распаўсюджвання дрэў перамяшчаецца літаральна на вачах, і гэта нельга не ўлічваць пры іх пасадцы. І тут — неабсяжнае поле для эксперыментаў, гаворыць дырэктар Рэчыцкага лясгаса Дзмітрый Глусцоў:

— Статус вопытнага лясгаса нас абавязвае пастаянна ўкараняць новыя тэхналогіі. Мы працуем сумесна з інстытутам лесу НАН. Свае ідэі супастаўляем з распрацоўкамі вучоных і тут іх увасабляем. У нас ёсць спецыяльныя плантацыі, дзе збіраецца насенне ад самых лепшых дрэў. Да таго ж, у якасці эксперымента паспрабуем стварацца пойменныя дубровы. У нас ужо расце гай рэліктавага аксаміта амурскага. Сёлета закупілі і пасеялі ў спецыяльныя касеты амаль 30 тысяч насення бука.

Мастацкі пленэр на беразе Дняпра.

Закрытыя карані павялічаць прыжывальнасць

Дарэчы, жыццё многіх лясных дрэўцаў зараз адбываецца не толькі ў адкрытым грунце, але і ў цяплічных умовах. У Рэчыцкім вопытным лясгасе ёсць пастаянны лясны гадавальнік плошчай пяць гектараў. У ім штогод вырошчваецца каля 2,2 мільёна сеянцаў такіх асноўных пародаў, як хвоя, дуб, бяроза, алешына чорная, ліпа, каштан...



Намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Святлана КРЫКУН і галоўны ляснічы Рэчыцкага вопытнага лясгаса Дзмітрый ДАВЫДЗЕНКА каля паляўнічага дамка.

Не так даўно рэчыцкія лесаводы пачалі вырошчваць пасадачны матэрыял па фінскай тэхналогіі — з закрытай каранёвай сістэмай. Гэта значыць, насенне высяваецца ў касеты, напоўненыя спецыяльным глебавым субстратам. Касеты, усталяваныя на паддоны, спачатку знаходзяцца ў цяпліцы пад плёнкай, потым яе здымаюць і пакідаюць сеянцы на адкрытым паветры для гартавання. Выкарыстанне такіх сеянцаў для наступнай пасадкі дазваляе падоўжыць тэрміны пасадкі, а таксама значна павялічыць прыжывальнасць высаджаных раслін.

Прынамсі, у гадавальніку сёлета плануюць пачаць будаўніцтва сучаснага селекцыйна-лесанасеннага цэнтра па вырошчванні пасадачнага матэрыялу з закрытай каранёвай сістэмай. У цэлым па краіне запланавана будаўніцтва шасці такіх цэнтраў. Гэта аналаг Рэспубліканскага лясноага селекцыйна-насенняводчага цэнтра, які будзе мець статус абласнога значэння. Плануецца штогод вырошчваць каля 6 мільёнаў сеянцаў асноўных пародаў дрэў.

Вяровачны парк.

Букавель для тых, хто працуе

— У лясной гаспадарцы працаваць зусім не проста, — адзначае **намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Святлана КРЫКУН.** — З раніцы да вечара леснікі і вальшчыкі ў лесе. Асобныя нясуць дзяжурства дапазна. Пры гэтым у нашым калектыве няма цякучкі кадраў і свабодных вакансій. Многія супрацоўнікі ездзяць на работу з райцэнтра штодзень — для гэтага арганізаваны спецыяльны транспарт. Да таго ж сацыяльны пакет у нашым лясгасе прадугледжвае шмат пераваг. Акрамя звычайных дапамог па калдагаворы, выплачваем абавязкова дапамогу да адпачынку. Дадаткова — за стаж сумленнай работы. Работнікі, якія добра сябе зарэкамендавалі, могуць атрымаць беспрацэнтную пазыку пад бытавыя патрэбы на тры гады. Работнікі ўдзельнічаюць у розных спаборніцтвах, а каб яны падтрымлівалі спартыўную форму, арандуем залы для заняткаў валейболам, футболам, трэнажорную і басейн. Сёлета мы з'ездзілі на экскурсію ў Санкт-Пецярбург, а зімой наведалі гарналыжны курорт Букавель. Летась была арганізавана паездка на Чорнае мора. Можа, яшчэ і таму людзі за работу трымаюцца, што ў нас вельмі шмат сямейных дынастый. Дзеці ганарацца, што працягваюць справу бацькоў і нясуць перад імі адказнасць.

— У нашым лясгасе працуе 340 чалавек. Гэта людзі, душой адданыя сваёй справе, — падагульняе дырэктар Рэчыцкага вопытнага лясгаса Дзмітрый Глусцоў. — Сёлета мы плануем пабудаваць і запусціць яшчэ і цэх пілавання, для чаго ўжо набылі неабходнае абсталяванне. Важна ў сучасных эканамічных умовах думаць пра развіццё і зарабляць грошы.

УНП 400000205.

ЦЯПЕР БЕЗ ЖАЛЕЗА!

З кранаў жыхароў Рэчыцы нарэшце цячэ чыстая вада

Пабудаваная станцыя абезжалезвання ў Рэчыцы нарэшце вырашыла праблемы жыхароў з пітной вадой. Горад з насельніцтвам у 65 тысяч чалавек з мая пачаў спажываць ваду, якая адпавядае ўсім санітарным нормам і правілам, сцвярджае дырэктар філіяла «Рэчыцаводаканал» КУП «Рэчыцкі райжылкамгас» Уладзімір РЫБАКОЎ.

Будаўніцтва станцыі на водазаборы «Галаўны» планавалася даўно. Магчымасць з'явілася, калі Міжнародны банк рэканструкцыі і развіцця выдаткаваў на рэалізацыю праекта пазыку ў памеры $2 млн 175 тысяч. Цяпер усе сродкі засвоены, аб'ект пабудаваны, станцыя ўведзена ў эксплуатацыю. Дарэчы, гэта работа — частка дзяржаўнай палітыкі, якая на сённяшні дзень замацавана спецыяльнай праграмай «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» і яе падпраграмай «Чыстая вада» на 2016—2020 гады».

— На працягу 9 гадоў мы ніяк не маглі рэалізаваць гэты важны сацыяльны праект. Будаўніцтва працягвалася 8,5 месяца. За гэты кароткі тэрмін мы цалкам пабудавалі станцыю новага пакалення. Яе сапраўды можна назваць унікальнай. Станцыя цалкам аўтаматызаваная. Яшчэ адзін бясспрэчны плюс — энергаэфектыўнасць. Вада паступае на ачыстку без дадатковага помпавага абсталявання, самацёкам. Віцебскае прадпрыемства, якое спецыялізуецца на падобных аб'ектах, зрабіла станцыю «пад ключ»: ад замовы, вытворчасці абсталявання, пусканаладачных работ да сэрвіснага абслугоўвання.

У Рэчыцы скарыстана адна з апошніх распрацовак — безнапорная блокава-модульная станцыя «Крышталь-Б». У кампактным блокава-модульным будынку размешчаны восем вялікіх ёмістасцяў. Гэта біярэактары, дзе вада са свідравін спачатку акісляецца пры дапамозе кісларода. 24 трохі меншыя слоікі — непасрэдна фільтр-модулі. Тут адбываецца другі этап ачысткі. Пры гэтым выкарыстоўваецца палімернае рэчыва айчыннай вытворчасці, тлумачыць Уладзімір Аляксандравіч:

— У станцыях папярэдняга пакалення выкарыстоўваліся друз, кварцавы пясок і вугаль, а ў новай — палімерная крошка. Менавіта на яе асядае жалеза. Брудная вада скідваецца, а чыстая ідзе спажыўцу. Дарэчы, новая станцыя яшчэ і не такая затратная. Бо некаторыя кампаненты ў старых — напрыклад, кварцавы пясок, дастаўляліся з-за мяжы.

У новай станцыі ачышчаная вада паступае ў назапашвальныя рэзервуары і адтуль пры дапамозе помпаў станцыі другога ўздыму — спажыўцам. Асадак з ачышчальных установак адпраўляецца ў спецыяльныя шламанакапляльнікі, размешчаныя побач з будынкам станцыі. Прадукцыйнасць новай станцыі абезжалезвання — 25 000 метраў кубічных у суткі. Трэба дадаць, што зімой жыхары Рэчыцы ў сярэднім расходуюць 8000—12000 кубаметраў вады, а летам — да 23 000.

— Паводле санітарных правілаў і нормаў, у чыстай вадзе лімітавана дапушчальная канцэнтрацыя жалеза — да 0,3 міліграма на літр, — расказвае Уладзімір Рыбакоў. — Цяпер у пітной вадзе 0,1 міліграма жалеза на літр. Між іншым, раней мы падавалі ваду з утрыманнем жалеза — 0,6—0,7 мг. Пасля ўводу станцыі ў нас увесь горад і некалькі населеных пунктаў вакол будуць забяспечвацца ачышчанай вадой. Мы вельмі рады, што стала менш скаргаў ад насельніцтва з-за прычыны няякаснай вады.

Між тым перыяд наладкі і ачышчэння труб будзе працягвацца да верасня. Бліжэй да восені сітуацыя з вадой у Рэчыцы павінна канчаткова стабілізавацца, запэўнівае кіраўнік «Рэчыцаводаканала»:

— У нас жа 70 гадоў водаправодным трубам. Паралельна з будаўніцтвам станцыі абезжалезвання вялася і працягвае праводзіцца работа па прамываннi сетак. Ужо адпрацаваны асноўныя вадаводы, шэраг вулічных і тупіковых сетак. Асноўны аб'ём адкладаў, назапашаны за шматлікія гады эксплуатацыі, знаходзіцца непасрэдна ў трубах. Каб вымыць асадак, спатрэбіцца нейкі час.

Цяпер у Рэчыцкім раёне працуе восем станцый абезжалезвання: у Рэчыцы на водазаборах «Паўднёвы» і «Галаўны», у населеных пунктах Бабічы, Васілевічы і Зарэчча, Зашчоб'е, Холмеч і Ліскі.

Да 2020 года пастаўлена задача забяспечыць усё насельніцтва краіны вадой пітной якасці. Таму ў Рэчыцы сёлета распрацоўваецца праектна-каштарысная дакументацыя для яшчэ двух падобных аб'ектаў: у вёсках Заспа і Каравацічы. Паводле праграмы будаўніцтва станцый абезжалезвання, у раёне да 2020 года яны павінны быць пабудаваны ў вёсках Белае Балота, Ведрыч, Камсамольск, Чырвоная Дуброва, Левашы, Азершчына, Перасвятое.

Уладзімір Рыбакоў дадае, што да таго ж у Рэчыцы патрабуюць рэканструкцыі і гарадскія ачышчальныя збудаванні:

— Ачысныя збудаванні нам перадалі ад гідролізнага завода 15 гадоў таму. Мы плануем, што ў найбліжэйшы час «Рэчыцаводаканал» увойдзе ў праграму Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця з праектам па іх аднаўленні. Спадзяёмся, што калі нам выдзеляць сродкі, мы зробім у Рэчыцы і самыя сучасныя ачышчальныя збудаванні.

УНП 401157903

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	Минское районное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24

Предмет аукциона

Недвижимое имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Путейко, д. 5

Наименование	Общая площадь	Инвентарный номер
Магазин «Стройматериалы»	3673,6 кв. м	600/С-104416
Составные части и принадлежности: подвал, склад, пристройка, рампа, вход в подвал, гараж		
Хозяйственное здание»	23,2 кв. м	600/С-140551
Составные части и принадлежности: крыльцо		

Сведения о земельном участке: пл. **0,8520** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений магазина «Стройматериалы». Ограничения (обременения) прав: водоохранная зона Заславского водохранилища, площадь 0,8520 га

Обременения: аренда. Подробная информация на сайте организатора аукциона cpo.by

Начальная цена лота с НДС 20 % – 1 645 200,00 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Аукцион состоится 14.08.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 10.08.2018** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by**. Email: auction@cpo.by**

РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 13 августа 2018 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже объектов недвижимости, принадлежащих Речицкому районному потребительскому обществу Гомельской области на праве собственности

№ лота	Наименование объекта, его место нахождения	Краткая характеристика объекта	Начальная цена, руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %)	Задаток, руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %)
1	Здание магазина «Купалинка», **инв. № 340/С-288894,** Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Дзержинского, 2А	Назначение: здание специализированное розничной торговли. Одноэтажное кирпичное строение 1978 года постройки. Общая площадь 164,7 кв. м. Составные части и принадлежности: сарай.	45 432,00	4 543,00
Земельный участок для обслуживания здания на праве аренды площадью **0,0620 га** с кадастровым номером 324550100001001181. **Договор аренды** земельного участка сроком **по 23.07.2019 г.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь				
2	Здание магазина «Окей», **инв. № 340/С-290658,** Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Нефтяников, 92	Назначение: здание специализированное розничной торговли. Одноэтажное кирпичное строение, год постройки не определен. Общая площадь 225,3 кв. м. *Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка, кирпичная холодная пристройка, холодная пристройка из газосиликатных блоков и силикатного камня*	61 608,00	6 160,00
***Земельный участок** для обслуживания здания на праве аренды площадью **0,1207 га** с кадастровым номером 324550100001001691. **Договор аренды** земельного участка сроком **по 16.11.2024 г**. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь*				

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 9 августа 2018 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **13 августа 2018 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.

При подаче заявления участник должен иметь: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно предоставляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY84ALFA30122305700080270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту №**__ согласно извещению в газете «Звязда» от 11 июля 2018 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за Объект, такая оплата должна быть произведена в течение 10 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи Объекта

Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23.
Тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95 • сайт: gino.by • e-mail: auction-gino@gino.by
Продавец: Речицкое райпо Гомельской области, Гомельская обл., г. Речица, ул. Привокзальная, 2. Тел.: 8 (02340) 5-48-28, 8 (029) 920-06-29

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(организатор аукциона)* по поручению **ОАО «Борисовская швейная фабрика»** (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:

Лот № 1. Производственный цех, общ. пл. 1462,1 кв. м, инв. № 610/D-61785, по адресу: **г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 9/2-3,** имущество согласно перечня *(с перечнем можно ознакомиться у организатора торгов)***.**

Начальная цена с НДС – 73 862,74 бел. руб. ***Стоимость снижена на 80 %.*** **Задаток 10 % (7 386,00 бел. руб.).**

Лот № 2. Изолированное помещение, общ. пл. 3992,4 кв. м, инв. № 610/D-65612, по адресу: **г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 9/1-3**.

Начальная цена с НДС (20 %) – 117 513,60 бел. руб. ***Стоимость снижена на 80 %.*** **Задаток 10 % (11 751,00 бел. руб.).**

Задатки в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.06.2018. Аукцион состоится **31.07.2018 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.07.2018 до 16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

■ Як гэта было

РАССТРАЛЯНАМУ ВЕРЫЦЬ...

Вайна лічыцца завершанай, гавораць бывалыя людзі, калі пахаваны апошні загінулы салдат. Але бываюць і выключэнні. Амаль 60 гадоў пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны змагалася жыхарка Барысаўскага раёна Аліна Філіпаўна Камоска за вяртанне чэснага імя свайго бацькі, Філіпа Іванавіча, незаконна расстралянага ў партызанскім атрадзе імя А. В. Суворава Мінскай вобласці.

Дапамагала жанчыне пераадольваць шматлікія цяжкасці рэспубліканская камісія па справах былых партызан і падпольшчыкаў (з дня ўтварэння якой у гэтыя дні спаўняецца 50 гадоў).

ПЕРШАЯ назва камісіі — рэспубліканская камісія па выдачы пасведчанняў партызана Беларусі. Яна пачала сваю работу 15 мая 1968 года ў складзе І. Ф. Клімава (старшыня), А. Ю. Дзенісевіча, М. М. Джагарава, А. А. Здановіча, В. І. Лівенцава, М. П. Пакроўскага, С. З. Пачаніна. На першым пасяджэнні сакратаром быў выбраны М. Д. Віцько. 29 снежня 1979 года пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР камісія па выдачы пасведчанняў партызана Беларусі пераўтворана ў камісію па справах былых партызан і падпольшчыкаў пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета БССР.

Галоўнай мэтай камісіі з'яўлялася дапамога ўдзельнікам партызанскага і падпольнага руху, якія па той ці іншай прычыне не атрымалі неабходных дакументаў аб сваёй дзейнасці ў тыле ворага. Для вырашэння сваіх пытанняў яны павінны былі прадставіць у камісію тры пацвярджэнні аб удзеле ў партызанскай ці падпольнай барацьбе, баявую характарыстыку, падпісаную прадстаўніком партызанскага ці падпольнага камітэта, асабістую заяву з падрабязным апісаннем сваёй дзейнасці на акупаванай ворагам тэрыторыі. Дакументы разглядаліся камісіяй на прадмет выдачы заяўніку ветэранскага пасведчання — «Партызан Беларусі». Пасля Івана Клімава камісію ўзначальвалі ветэраны вайны, грамадскія дзеячы Анатоль Андрэеў і Яўген Мікульчык.

Некалькі слоў аб дакументальнай базе камісіі па справах былых партызан і падпольшчыкаў. Патрэбныя ёй дакументы ў асноўным знаходзяцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Гэта картатэкі персанальнага ўліку на 350 тысяч партызан і сувязных, на 1100 работнікаў падпольных партыйных органаў, на 6138 удзельнікаў Мінскага антыфашысцкага падполля, на 8000 загінулых, зніклых без вестак. Усё гэта вынік вялікай адданай працы работнікаў партыйнага архіва, пачатай яшчэ ў 1942 годзе ў г. Уфа, куды архіў быў эвакуяваны.

З 1966-га па 1983 год работнікамі партархіва разгледжана 11 тысяч матэрыялаў аб прызнанні грамадзян удзельнікамі партызанскага і падпольнага руху, узята на дадатковы ўлік 5900 чалавек. І ўсё гэта зроблена пры ўдзеле членаў Рэспубліканскай камісіі па справах былых партызан і падпольшчыкаў.

Але бываюць і сустрэчы, якія надоўга застаюцца ў памяці гісторыкаў-архівістаў з-за неардынарнасці чалавечага лёсу. Менавіта такой аказалася архіўная справа Філіпа Іванавіча Камоскі.

ПІСЬМЫ ў абарону Філіпа Іванавіча Камоскі, можна сказаць, не ўвайшлі, а ўварваліся ў жыццё і дзейнасць камісіі. Сярод грунтоўных першых зваротаў (ліпень 2004 года) — успаміны Зінаіды Дзмітрыеўны Ганчаровай (па першым мужу — Камоска). Вось што ў іх гаворыцца:

«Восенню 1943-га мой муж, Камоска Філіп Іванавіч, і я пайшлі ў партызаны. З сабою ўзялі і дваіх маленькіх дзяцей (Аліну і Машачку). Мужа залічылі партызанам у атрад імя А. В. Суворава Мінскай вобласці. Я з дзецьмі пражывала ў сямейным партызанскім лагеры і ў вёсках партызанскай зоны. Як магла, дапамагала партызанам.

Зінаіда Дзмітрыеўна і Філіп Іванавіч КАМОСКІ напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.

Муж, Філіп Іванавіч, выконваў свае розныя заданні. Аднойчы хтосьці паведаміў мне аб наступным. Трое партызан, і мой муж у тым ліку, стаялі на пасту ў лесе побач з вёскаю Святое. Было холадна. Яны пайшлі ў дом, каб сагрэцца і трошкі адпачыць. Муж задрамаў. А тут наляцеў вораг, акружыў дом. Забілі Удовіна (прозвішча партызана. — **Аўт.**), *другога паранілі. Яго прозвішча я забыла... А мужа майго схапілі, кінулі ў машыну і адвезлі ў вёску Персцень. Там знаходзіўся нямецкі гарнізон. Мужа кінулі ў склеп ці ў дзот. У яго ў боце быў нож, якім ён ноччу выдзеўбаў дзірку, уцёк і вярнуўся ў атрад. Пасля гэтага ён прыходзіў наведваць мяне і дзяцей разы два. Хутка я пачула, што майго мужа расстралялі. Я спрабавала аб усім даведацца, хадзіла туды, дзе знаходзіўся атрад. Гэта вёска Дубнікі ці Замосце. Мне адказалі (не ведаю, хто гэта быў), што гэта няпраўда, што Ф. І. Камоска адпраўлены далёка на заданне.*

Аднойчы прыехалі двое ў нашу зямлянку. Адзін быў Калека, імя другога не помню. Яны загадалі збірацца і ісці на вуліцу. Я кінула з кіпячага чыгунка пялёнкі ў мяшок, узяла дзяцей і пайшла. На вуліцы стаяў конь з санямі. Мне загадалі сесці ў сані і павезлі. Па дарозе распытвалі ў мяне, якія сваякі ў мяне, якія сваякі ў майго мужа, дзе яны жывуць. Прывезлі нас у вёску Курганы да Патаповіча Антося. Загадалі яму, каб ён даў кут для жылля, і паехалі. Кармілі мяне людзі. Хадзіла і прасіла па вёсках ежу, з сабою на руках насіла сямімесячную дачку. Прасілі людзі аддаць яе. Казалі, што я не змагу пракарміць. Але я не аддала. І я была з усімі. З двума дзецьмі было цяжка бегчы. Сіл не хапала. І я пасадзіла дзяцей на ўзгорак. Рашыла, што Бог дасць, тое і будзе. Чую брэх нямецкіх аўчарак. Але тут вярнуўся гаспадар па мяне з сынам. Узяў дзяцей на рукі, я следам.

Пасля вызвалення я звярнулася да кіраўніцтва брыгады па дакументы пра майго мужа. Мне адказалі, што дакументы яшчэ не гатовыя. Мне на рукі выдалі паперу, у якой напісана, што я пражывала бежанкай у партызанскай зоне. Я звярнулася ў райсабес з заявай аб пенсіі па мужу. У пенсіі мне адмовілі. Упершыню я прачытала ў іх адказе, што мой муж расстраляны як здраднік радзімы. Гэта было прыкладна ў 1954—1955 гадах. Да гэтага часу я ўжо была другі раз замужам. Нарадзіла траіх дзяцей. Муж прапанаваў удачарыць маіх дзяўчатак і даць ім сваё прозвішча. Але я адмовілася, я верыла, што бацька маіх дзяцей забіты незаконна...»

МІНУЎ час, і разам з маці змагацца за бацьку пачала яго дачка — Аліна Філіпаўна. У адным са зваротаў яна піша:

«Амаль 60 гадоў мая мама і я шукаем прычыну расстрэлу майго бацькі. Я правяла ўласнае расследаванне, сустракалася з партызанамі, якія засталіся жывымі. Гэта: Лідзія Еўдакімаўна Нікалаева (радавая партызанка, жонка камандзіра атрада), Ніна Антонаўна Чыстая (медсястра), Уладзімір Аляксандравіч Мурашка (радавы), Мікалай Іванавіч Нішчаглотаў (начальнік боезабеспячэння), Ціхан Яфрэмавіч Мазалёў (начальнік асобага аддзела атрада, намеснік камандзіра па разведцы). Усе яны ў адзін голас заявілі, што ніякага расследавання, звязанага з расстрэлам Ф. І. Камоскі, не было, што ніякага суда і публічнага расстрэлу таксама не было, што гэта было самаўпраўства ў адносінах да партызана Ф. І. Камоскі.

Я ўпэўнена, што майго бацьку абылгалі ў здрадзе радзіме. У партызанскай зоне ў бацькі заставалася сям'я. Добраахвотная здача ў палон ставіла пад пагрозу жыццё сям'і. У канцы 1943 года ўжо была вызвалена значная частка нашай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Як ён мог у гэтых абставінах здацца ў палон ворагу? Потым зноў пайсці ў партызаны? Партызан М. М. Камель, які таксама трапіў у палон, не ўцёк, немцы яго вывезлі ў Германію, адкуль ён потым вярнуўся дамоў. Пра гэта мне расказалі яго брат і сястра, якіх я адшукала. Па звестках Чэрвеньскага райваенкамата М. М. Камель у 1991 годзе атрымаў пасведчанне партызана.

Філіп Іванавіч КАМОСКА, партызан, радавы, незаконна расстраляны 29.12.1943 г.

Пасля вайны мая мама сустракалася з Пятроўскім (камандзір партызанскага атрада, у якім служыў Ф. І. Камоска. — **Аўт.**). *Мама ведала ў той момант аб расстрэле бацькі. Пятроўскі абяцаў маме зрабіць усё, каб рэабілітаваць бацьку, паклапаціцца аб назначэнні пенсіі за гібель майго бацькі. Гэта было ў 1956 годзе, пасля 20-га з'езда партыі, калі пачалі гаварыць пра парушэнні законнасці ў мірны час і асабліва ў гады вайны. Гэта ўсё вымусіла яго рабіць такія абяцанкі. Ён так нічога і не зрабіў, толькі змяніў месца жыхарства. Мабыць, спецыяльна, каб не сустракацца з мамай. Яго жыццёвы шлях закончыўся трагічна. У пачатку 80-х гадоў ён застрэліўся».*

«На працягу ўсяго жыцця, — з прыкрасцю піша далей Аліна Філіпаўна, — *наша сям'я адчувала нейкую сваю непаўнацэннасць. Калі пасля вайны ўдовам у вёсках дзялілі фасолю, маму выкрэслівалі са спісаў па прычыне таго, што яе мужа забілі партызаны. У пенсіі на дзяцей ёй было адмоўлена, бо мы былі дзецьмі здрадніка радзімы. У нашай бабулі кіраўнікі калгаса абрэзалі агарод, бо яе зяць (мой бацька) быў здрадніка радзімы. Я ў свой час баялася нават паступіць вучыцца туды, куды вельмі хацела. Аднойчы адзін «добразычлівец» перад усім калектывам аб'явіў, што я дачка здрадніка радзімы.*

Сардэчна прашу азнаёміцца з усім комплексам дакументаў па справе майго бацькі, незаконна расстралянага па загадзе камандзіра ініцыятыўнай групы І. П. Пятроўскага».

ПЕРАДА мною архіўная ўліковая справа № 42342 Філіпа Іванавіча Камоскі. Яе агульны аб'ём — 30 старонак. Аб чым яна? Шмат аб чым з пункту гледжання колькасці слоў, пастаўленых пытанняў, патрачанай паперы. Але міма некаторых паняццяў нельга прайсці. Гэта загад № 8 ад 28 снежня 1943 года па ініцыятыўнай групе І. П. Пятроўскага (так на той час называўся партызанскі атрад імя А. В. Суворава. — **Аўт.**) партызанскай брыгады «Разгром» аб здачы ў палон двум французам Камоскі Філіпа Іванавіча; гэта пастанова камандавання партызанскай брыгады «Разгром» аб здачы ў палон Ф. І. Камоскі двойчы: спачатку немцам, у жніўні 1941 года, у баях пад Магілёвам, а ў снежні 1943-га — каля вёскі Святое — двум французам (якія ваявалі на баку Германіі). Што іх аб'ядноўвае? Прысуджэнне Ф. І. Камоскі да расстрэлу. А што розніць? Адсутнасць подпісаў пад пастановай камандавання партызанскай брыгады «Разгром» камандзіра брыгады М. Х. Балана, камісара брыгады А. В. Зямскога.

Так пачалося дадатковае расследаванне лёсу Ф. І. Камоскі, удзел у якім прымалі рэспубліканская камісія па справах былых партызан і падпольшчыкаў, Беларуская ваенная пракуратура.

Камоска Філіп Іванавіч, 1915 г. н., ураджэнец вёскі Вярсанка Халопініцкага раёна Мінскай вобласці. Член ЛКСМБ, адукацыя — пяць класаў вясковай школы. Органамі савецкай улады не рэпрэсіраваўся, у Чырвонай арміі служыў. Жанаты, сям'я — чатыры чалавекі.

Некалькі слоў аб ініцыятыўнай групе І. П. Пятроўскага, у якой 17.10.1943 г. аказаўся Ф. І. Камоска. Агульная колькасць партызан — 90 чалавек, з іх мужчын — 87, жанчын — 3, беларусаў — 23, рускіх — 64, украінцаў — 3; членаў партыі — 1. Маюцца на ўзбраенні: 7 аўтаматаў, 11 вінтовак, 5 пісталетаў, 25 гранат.

Устаноўлена, што за загадам І. П. Пятроўскага № 8 хаваецца наступнае: 6 снежня 1943 года група разведчыкаў з навічком Ф. І. Камоскам выконвала заданне ў вёсцы Святое. (Сачылі за перамяшчэннем ворага.) Група падзялілася на дзве часткі. Камоска, без зброі, быў пакінуты ў хаце, а яго таварышы Удовін (камандзір групы) і Камель пайшлі да мясцовага насельніцтва ў пошуках ежы. Ёсць падазрэнне, што хтосьці з мясцовых жыхароў паведаміў немцам аб з'яўленні партызан з пабарамі. Нечакана прыбылыя французы ўступілі ў бой з «ляснымі братамі».

Вось рапарт начальніка штаба партызанскага атрада імя А. В. Суворава: «Даношу, што пры акружэнні вёскі Святое французамі Перзенскага гарнізона 6.12.43 г. у 15.00 быў узяты жывым адзін разведчык т. Камоска Філіп, начальнік разведкі т. Удовін Гаўрыла Іванавіч быў забіты». Ні слова аб здачы ў палон Камоскі, якая прыраўноўвалася да здрады.

9.12.1943 года Ф. І. Камоска чарговы раз быў дапытаны супрацоўнікамі контрразведкі. Знаёмства з матэрыяламі гэтай акцыі сведчыць аб адсутнасці якога-небудзь крыміналу ў ваеннай, грамадскай і партызанскай дзейнасці Ф. І. Камоскі. Яго адказы на пытанні былі цвёрдымі і праўдзівымі. На жаль, да іх не прыслухаліся тагачасныя дзеячы...

Пастановай Вярхоўнага Савета Беларусі ад 6.06.1991 г. «Аб парадку рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій 20—80-х гадоў у Рэспубліцы Беларусь» адменена пазасудовае рашэнне ад 28.12.1943 г. у адносінах да партызана Філіпа Іванавіча Камоскі. 13 верасня 2004 года ён рэабілітаваны пасмяротна.

Яўген БАРАНОЎСКІ,
кандыдат гістарычных навук

РЫБУ НА ЧАРАВІКІ

Рыбін мех — гэта жарт, а абутак са скуры рыб — праўда

Скура рыб — гэта адзін з каштоўных матэрыялаў, які з даўніх часоў закрануў практычна ўсе сферы жыццядзейнасці, пачынаючы з кулінарыі і заканчваючы адзеннем.

Па складзе і ўласцівасцях рыбіна скура набліжана да скуры іншых жывёл. Таўшчыня яе ў сярэднім — 1 міліметр. Адзенне з гэтай скуры з-за вельмі блізкага размяшчэння складнікаў яе валокнаў адзін да аднаго мае больш высокі ўзровень зносаўстойлівасці і трываласці ў параўнанні з адзеннем са скуры жывёлы. Да таго ж скураныя вырабы з рыбы воданепранікальныя, таксама яны больш бяспечныя з пункту гледжання экалогіі і не могуць з'яўляцца пераносчыкамі інфекцыйных захворванняў у адрозненне ад вырабаў са скуры жывёлы. Апрацоўка рыбінай скуры менш шкодная для навакольнага асяроддзя, а матэрыял, які атрымліваецца, бяспечны для дзяцей.

Працэс вырабу скуры рыб у далёкім мінулым быў працаёмкім і займаў нямала часу. Спачатку з рыбы здымалі луску, затым старанна вычышчалі з абодвух бакоў і некалькі разоў прамывалі ў вадзе, раскладвалі на гладкай паверхні і пакідалі на некаторы час сушыцца. Сухая рыбіна скура станавілася вельмі жорсткай. Затым на працягу некалькіх гадзін яе прыходзілася камячыць на спецыяльным станку касцянымі нажамі для апрацоўкі скуры. У выніку гэтай саматужнай апрацоўкі скура пазбаўлялася многіх каштоўных уласцівасцяў, аднак сам па сабе працэс прыводзіў да жаданага выніку — вырабы атрымліваліся і насіліся. Шматлікія традыцыйныя промыслы і рамёствы карэнных народаў ханты і мансі зараз практычна страчаны, у тым ліку і асаблівасці і сакрэты тэхналогій вырабу рыбінай скуры.

Народы, якія засялялі берагі Амура (нанайцы, арочы, ніўхі і ульчы), стварылі безадходную вытворчасць: мяса рыбы ішло ў ежу, рыбін тлушч — для апрацоўкі скуры, рыбіна скура — для пашыву адзення, панчох, абутку і розных іншых бытавых дробязей. Уручную апрацаванае пашытае адзенне з гэтага матэрыялу стала яркім узорам культуры прыамурскіх народаў, якія атрымалі назву «рыбінаскурых людзей». Гэты матэрыял валодае ўсімі неабходнымі якасцямі для прамысловага адзення. Ён лёгкі, трывалы, засцерагае ад ветру, не намакае, добра захоўвае цяпло. А скура асобных відаў рыб у некалькі разоў перасягае па трываласці многія матэрыялы.

Скура ментуза, напрыклад, вельмі трывалая, вытрымлівае вагу каля двух пудоў. З яе шыюць мяшкі для гаспадарчых мэт, выкарыстоўвалі раней замест шкла ў вокнах у зімовы час. Таксама са скуры ментуза народнасці ханты і мансі ў мінулым шылі непрамакальныя пакрыцці на лодкі і палаткі, хоць у якасці такой сыравіны асабліва шанавалася скура асятра. Незаменныя былі палотнішчы з асятровых скур у якасці покрывак на нарты з прадуктамі, яны былі абсалютна непранікальныя для вільгаці і да таго ж іх не прагрызалі алені. Таксама з асятровай і шчупачынай скуры шылі непрамакальны абутак. Скура акулы, «шчыгрынавая скура» — лёгкая, эластычная і вельмі трывалая. Па трываласці ў дзесяць разоў перасягае цялячую або скуру буйвала. У сярэдзіне XX стагоддзя скура акулы выкарыстоўвалася для вырабу куртак лётчыкаў. Скура ската — найвялікшая рэдкасць, неверагодна трывалая і вельмі цяжка паддаецца апрацоўцы. Дзякуючы сваёй трываласці яна практычна не патрабуе якога-небудзь дагляду, не ўбірае ў сябе вільгаць, амаль не схільная да забруджванняў, ідэальна падыходзіць для вырабу верхняга адзення. Скуру акул і марскіх скатаў нават выкарыстоўваюць для пашыву вадалазных касцюмаў і вытворчасці мэблі. Прамысловая вытворчасць вырабаў з рыбінай скуры пачалася ў часы Першай сусветнай вайны ў Нарвегіі. Цяпер тэхналогія вырабу рыбінай скуры сур'ёзна ўдасканалена.

Нанайскі мужчынскі касцюм з рыбінай скуры.

Скура рыб звычайна невялікая па памерах, і ў яе экзатычны знешні выгляд. Багатая і часта высакародная колеравая гама (ад чорнага і жамчужна-шэрага да залацістага адцення) і унікальны малюнак на паверхні робяць скуру эксклюзіўным матэрыялам. Паколькі каштуе яна даволі дарога, разумней выкарыстоўваць скуру рыб у якасці аздаблення менавіта элітных вырабаў. На гэты дзівосны матэрыял звярнулі сваю ўвагу сусветна вядомыя мадэльеры. У мінулым сезоне дызайнер Christian Dior Джон Гальяна стварыў ружовыя туфлі са скуры ласося, якія прадаваліся ў буціках па ўсім свеце. Шатландская кампанія Skini нядаўна запусціла лінію па вытворчасці бікіні таксама са скуры ласося і рэкламуе іх як альтэрнатыву вырабам са скуры экзатычных жывёл. Скура ласося — адна з самых даўгавечных і трывалых сярод усіх відаў рыбінай скуры. А дызайнеры адной аргенцінскай кампаніі, напрыклад, распрацавалі і выпусцілі ўнікальныя кеды, зробленыя са скуры сямейства селядцовых.

З-за памераў рыбінай скуры часцей за ўсё гэты матэрыял, акрамя вытворчасці абутку, выкарыстоўваюць і для стварэння невялікіх аксесуараў: сумачак, партманэ, пальчатак, паясоў, чахлоў для мабільнікаў і розных упрыгажэнняў. Многіх спажыўцоў цікавяць эксклюзіўныя мадэлі мабільных тэлефонаў у чахлах ручной работы. І кітайцы тут жа прадставілі на рынку тэлефон, абцягнуты скурай рыбы гурамі жамчужнай, які каштуе... 650 долараў.

■ Дайджэст

У ЗША БЕСПІЛОТНІКІ ДАСТАВЯЦЬ ПРАДУКТЫ

Звыклае нам аблічча дастаўкі тавараў за мяжой усё больш сыходзіць у бок выкарыстання беспілотнай тэхнікі замест людзей-кур'ераў. А нядаўна буйны амерыканскі рытэйлер Kroger сумесна з кампаніяй Nuro наважыліся змяніць і дастаўку прадуктаў харчавання. Новы сэрвіс ужо пачаў сваю работу.

Удзельнікі праекта — Kroger, адна з самых буйных амерыканскіх сетак супермаркетаў, заснаваная ў 1883 годзе. Па абароце яна саступае толькі шырока вядомай сетцы Wal-Mart. Nuro — гэта стартап, які збіраецца выкарыстаць невялікі рабатызаваны фургон для дастаўкі тавараў. Прычым першапачаткова спецыялізавацца канкрэтна на дастаўцы прадуктаў у Nuro не збіраліся, плануючы быць шматпрофільнай кампаніяй. Сам фургон Nuro мае кабіну з лабавым шклом і некалькі адсекаў для прадуктаў. На даху размешчаны лідар, сэнсары і камеры для арыентацыі ў прасторы.

Купля і заказ тавараў ажыццяўляюцца ў спецыяльнай праграме. Затым да карыстальніка прыязджае аўтамабіль, у кабіне якога на час тэставых выпрабаванняў сервісу будзе знаходзіцца аператар для таго, каб узяць на сябе кіраванне ў выпадку ўзнікнення надзвычайнай сітуацыі. Пасля завяршэння тэставага перыяду патрэбы ў аператары ўжо не будзе. Пасля таго як заказ дастаўлены, заказчык павінен будзе ўвесці на панэлі аўто атрыманы код, які дасць доступ да патрэбнага адсека. На дадзены момант невядомым застаецца толькі кошт дастаўкі прадуктаў такім спосабам і час канчатковага запуску ў эксплуатацыю. У астатнім жа праект выглядае даволі цікава і перспектыўна.

НАВУКОЎЦЫ СПАЛОХАЛІСЯ МАДЭЛІ НОВАЙ ЖАНЧЫНЫ

Прафесар анатоміі і антрапалогіі Брыстальскага ўніверсітэта Эліс Робертс стварыла «ідэальную» мадэль жанчыны будучыні, адкінуўшы эвалюцыйныя працэсы чалавецтва, і надзяліла яе больш прыдатнымі для жыцця органамі жывёл. Пра гэта яна расказала выданню Daily Mail.

На яе думку, дасягнуць дасканаласці чалавеку перашкаджае скура, якая пакутуе ад ультрафіялету. Найбольш прымальным варыянтам стала б выкарыстанне скуры жаб. Таксама сярод недахопаў значыцца сістэма дыхання, якой карыстаецца чалавек, — птушкі, якія выкарыстоўваюць паветраныя мяшкі, значна больш эфектыўна пазбаўляюцца ад вуглякіслага газу. Даследчыца ўзяла на ўзбраенне вушы кажаноў і кенгурыную сумку для выношвання нашчадкаў. Ногі Робертс замяніла на птушыныя, адзначыўшы, што пры гэтым павялічваецца хуткасць бегу, але знікае магчымасць залазіць на ўзвышшы. Але вынік атрымаўся не такім прывабным, як меркавала вучоная. «Калі я ўпершыню ўбачыла 3D-мадэль свайго эксперымента, я закрычала», — успамінае прафесар. Магчыма, на гэтым доследы з «ідэальнай» мадэллю жанчыны і скончацца

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

Што агульнага ў золата і марожанага?

Хімічную чысціню золата (А) нярэдка вызначаюць каратнай пробай: лічыцца, што сплаў на 24 караты складаецца з высакароднага металу не менш чым на 99,9 масавага працэнта. Паходжанне гэтай меры прасочваецца з часоў імператара Канстанціна, які ўвёў у абарачэнне соліды (залатыя манеты).

Такія манеты адліваліся з чыстага золата, важылі цэлых 24 караты (4,55 грама) і вельмі шанаваліся. Яны сталі прапарцыйнай мерай чысціні металу: напрыклад, 12-каратны сплаў складаецца з прымесяў напалову, а чырвонае золата 750-й пробы павінна мець не менш за 18 карат (750/1000 х 24). Але сама адзінка карата была запазычаная ў ювеліраў. Са спрадвечнай старажытнасці ў якасці меры вагі каштоўных камянёў яны карысталіся спелымі пладамі ражковага дрэва (B), якія адрозніваюцца выдатнай пастаяннасцю масы — 0,19-0,2 грама. Гэтыя бабовыя расліны шырока культывуюць па ўсім узбярэжжы Міжземнага мора. З іх пладоў атрымліваюць парашок кэраб, які ідзе на гатаванне традыцыйных страў і ў Іспаніі, і на поўначы Афрыкі, і ў Грэцыі. Часта ён выступае як заменнік какавы: кэраб нашмат таннейшы, менш салодкі і да таго ж амаль не змяшчае таксін тэабрамін, які робіць звычайны шакалад небяспечным для сабак і некаторых іншых жывёл. Але наогул бабы ражковага дрэва знайшлі прымяненне далёка за межамі міжземнаморскай кухні. З іх атрымліваюць камедзь — складаную сумесь простых вугляводаў, вядомую ў якасці харчовай дабаўкі E410. Камедзь ражковага дрэва бяспечная, яе выкарыстанне дазволена практычна паўсюдна, звычайна ў ролі эмульгатара. E410 уваходзіць у склад большасці гатункаў марожанага (С): яна дазваляе астуджаць сумесь без утварэння ледзяных крышталёў і атрымліваць аднастайную і смачную масу.

Крынічны Ян — гэта халодны струмень вады, купальскія кветкі і капліца з драўлянай выявай Яна (Іаана) Златавуста — хрысціцеля Ісуса. Прынамсі, гэтак павінна быць і так ёсць на крынічным комплексе, які знаходзіцца на памежжы Глыбоцкага і Мёрскага раёнаў на беразе маленькай рачулкі Аўта.

Не першае стагоддзе працягваецца традыцыя прыходзіць сюды на пачатку ліпеня ад праваслаўнай царквы, якая знаходзіцца ў вёсцы Чарневічы. Вернікі на чале са святаром ідуць за чатыры кіламетры — па лесе, полі, пералеску, на сваім шляху збіраюць кветкі — іх павінна быць не менш за сем — Янаўскае свята прыпадае на сёмага ліпеня. Настаяцель чарневіцкага прыхода айцец Сергій ужо болей за дваццаць гадоў бласлаўляе гэта лакальнае паломніцтва і асвячае ваду ў гэты дзень. Сёлета споўнілася дзесяць гадоў, як крыніца стала выглядаць па-новаму, можна сказаць незвычайна: калодзеж упрыгожаны бутам, з'явілася і купель, капліца атынкаваная, набыла прывабны выгляд. Дарэчы, асноўны руплівец упарадкавання крынічнага комплексу — **жыхар вёскі Язна Алег ВАЙЦАХОВІЧ,** які ў свята заўсёды бывае разам са сваімі землякамі. У капліцы знаходзіцца святыня — выява Яна: ён лічыцца апекуном крынічнай вады. Гэта скульптура — шэдэўр клерыкальнага мастацтва. На фэст Яна — так называюць свята мясцовыя жыхары — збіраюцца нават госці з Латвіі і Літвы — прыязджаюць на сваю малую радзіму. Святая крыніца сама кліча і збірае сюды і знаёмых, і нават чужых людзей.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Больш здымкаў гэтай падзеі глядзіце на сайце zviazda.by.

КРЫНІЧНЫ ЯН

Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.

Извещение о проведении 27 июля 2018 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк»

Сведения о продаваемом имуществе:

Номер предмета торгов	Информация об имуществе	Площадь, кв. м	Цена продажи, руб. с НДС 20 %	Размер задатка, руб.
1	Здание гаража (гараж № 32) с инв. № 610/С-44034 общей площадью 46,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001113 площадью 0,0039 га. Местоположение: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Герцена, д. 31	46,0	6480,00	648,00
2	Здание гаража (гараж № 33) с инв. № 610/С-44033 общей площадью 45,9 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001114 площадью 0,0031 га. Местоположение: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Герцена, д. 31	45,9	6480,00	648,00
3	Здание гаража (гараж № 34) с инв. № 610/С-44032 общей площадью 45,9 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001115 площадью 0,0031 га. Местоположение: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Герцена, д. 31	45,9	6480,00	648,00
4	Здание гаража (гараж № 35) с инв. № 610/С-1046 общей площадью 49,5 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001116 площадью 0,0029 га. Местоположение: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Герцена, д. 31	49,5	6480,00	648,00

Продавец имущества: Открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.

Организатор торгов: Консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г.Минск, ул. В. Хоружей, 22, к. 1703.

Повторные торги проводятся в форме аукциона в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и условиями проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк».

К участию в повторных торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет Консалтингового унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» BY32BAPB30122013100180000000 в ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X г. Минск, УНП 190982374 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Повторные торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе повторных торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если повторные торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в условиях проведения торгов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Повторные торги проводятся 27 июля 2018 года в 12.00 по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 91.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 11.07.2018 по 26.07.2018 включительно в рабочие дни с 08.30 до 12.30 и с 13.15 до 17.30 (по пятницам – до 16.15) по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22-1703.

Получить дополнительную информацию и ознакомиться с документацией по условиям и предметам торгов можно на сайте www.zalogbanka.by, mail: torgi@agroconsult.by

Телефоны для справок Региональной дирекции по Минской области ОАО «Белагропромбанк»: заместитель начальника отдела обеспечения деятельности банка Александр Леонидович Саевич – (017) 209 77 33, (029) 209 77 22.

Организатор аукциона: Tel/Fax (017) 399 66 39, GSM MTS (029) 816-64-46, GSM VEL (044) 540-64-46.

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона) 27 июля апреля 2018 года проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества со снижением начальной цены на 50 %

№ п/п	Сведения о предмете аукциона	Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. без НДС	Место нахождения имущества	Сумма задатка, бел. руб.
